© ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
ISSN 1819-3625 № 5 (2005)

# АРГАНІЗАЦЫЙНАЕ РАЗЬВІЦЬЦЁ ПАРТЫІ БНФ НАПЯРЭДАДНІ ПАРЛЯМЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ 2004 ГОДУ

## Спроба дасьледаваньня партыйнай арганізацыі ў Беларусі

*Юрый Чавусаў*

Мэтай дадзенага матэрыялу зьяўляецца вывучэньне Партыі БНФ як асноўнага элемэнту беларускай палітычнай апазыцыі ў кантэксьце выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга скліканьня. Гэтыя выбары адбыліся 17 кастрычніка 2004 году і былі сумешчаныя з правядзеньнем рэспубліканскага канстытуцыйнага рэфэрэндуму. Нашая ўвага будзе скіраваная на пытаньні разьвіцьця Партыі БНФ напярэдадні дадзенай палітычнай кампаніі, уключна з пытаньнямі арганізацыйнай пабудовы партыйных структураў і эвалюцыі партыйнай праграмы, нефармальных плыняў і груповак у межах партыі. Гэтыя чыньнікі паўплывалі на ўдзел Партыі БНФ у кааліцыйным будаўніцтве і ў выпрацоўцы стратэгіі аб’яднанай апазыцыі ў дачыненьні да парлямэнцкіх выбараў і рэфэрэндуму, вызначылі магчымасьці ўдзелу Партыі БНФ у фармаваньні выбарчых камісіяў, вылучэньня кандыдатаў у дэпутаты ад Партыі БНФ і ажыцьцяўленьня іншых дзеяньняў у межах передвыбарчай кампаніі; паўплывалі на ацэнку вынікаў і наступстваў дадзенай палітычнай кампаніі з пункту гледжаньня Партыі БНФ і выпрацоўку далейшай партыйнай стратэгіі на наступны палітычны пэрыяд. Па-за межамі дадзенага праблемнага поля мы лічым неабходным таксама закрануць аспэкт арганізацыйнай гісторыі Партыі БНФ, які мае выключнае значэньне для разуменьня сёньняшняга партыйнага разьвіцьця і партыйнай ідэалёгіі менавіта ў дачыненьні да Партыі БНФ. Кропкай адліку для падрыхтоўкі да парлямэнцкіх выбараў мы бярэм абвяшчэньне вынікаў выбараў прэзыдэнта ў 2001 годзе, паколькі менавіта празь пераасэнсаваньне тагачаснай партыйнай стратэгіі і праз далейшы ўдзел у мясцовых выбарах Партыя БНФ вызначыла пляны ў дачыненьні да выбараў парлямэнцкіх.

Пры напісаньні дадзенай працы мы зыходзім з таго, што аналіз беларускай палітычнай сыстэмы не павінны абмяжоўвацца аналізам узаемадзеяньня ў межах бінарнай схемы «ўлада-апазыцыя», а мусіць браць пад увагу стратэгіі разнастайных палітычных актораў, якія ўваходзяць у гэтыя два клясы ў якасьці складнікаў. Такі падыход да дасьледаваньня ўладных элемэнтаў (адміністрацыя прэзыдэнта, асоба Лукашэнкі, рэгіянальныя і галінова-гаспадарчыя кляны, спэцслужбы і лябісцкія групы, іншыя групоўкі ў межах кіраўнічай эліты і г. д.) і элемэнтаў апазыцыі (асобныя палітычныя партыі і надпартыйныя пабудовы, унутрыпартыйныя плыні і фракцыі, непартыйныя палітычныя групоўкі і іхнія лідэры, структуры грамадзянскай супольнасьці) ня толькі дазволіць атрымліваць веду пра сутнасьць беларускага палітычнага жыцьця, але таксама будзе спрыяць выпрацоўцы адэкватных палітычных стратэгіяў на полі практычнай палітычнай дзейнасьці.

З улікам гэтага мы лічым неабходным зрабіць кароткую папярэднюю заўвагу адносна нашага бачаньня сучаснага стану дасьледаваньняў бела-

рускіх палітычных партыяў, якая ня будзе мець за мэту бібліяграфічны аналіз партыйных дасьледаваньняў, а будзе адлюстроўваць нашую інтэрпрэтацыю метадалёгіі гэтага накірунку беларускага палітычнага мысьленьня. Пры ажыцьцяўленьні дадзенай працы выкарыстоўваліся наяўныя паліталягічныя дасьледаваньні, аналітычныя матэрыялы, публікацыі ў сродках масавай інфармацыі, дакумэнты Партыі БНФ і інтэрвію зь сябрамі кіраўнічых органаў партыі.

## Накірункі вывучэньня палітычных партыяў

У дадзены момант вывучэньне беларускай партыйнай сыстэмы і асобных пытаньняў партыйнага будаўніцтва знаходзіцца на пэрыфэрыі ўвагі навукоўцаў-палітолягаў. У вялікай ступені гэта выклікана малым уплывам палітычных партыяў на палітычныя працэсы — рэальна і апазыцыйныя партыі, і тыя з партыяў, што падтрымліваюць існую ўладу, ня ўключаныя ў працэс прыняцьця дзяржаўных рашэньняў, большасьць палітычных праектаў у сучаснай Беларусі ня маюць партыйнай асновы. Праўладныя палітычныя партыі ў выніку аўтарытарных памкненьняў кіраўнічага рэжыму не атрымліваюць ня толькі будзь-якога рэальнага значэньня альбо выгодаў (за выключэньнем асаблівага выпадку Лібэральна-дэмакратычнай партыі Беларусі, гэтыя арганізацыі ў палітычным сэнсе ёсьць фікцыяй, а мізэрныя дывідэнды атрымліваюць адно лідэры гэтых арганізацыяў), але нават пазбаўленыя рэальнай інстытуцыялізацыі хоць бы на ўзроўні, які маюць Беларуская фэдэрацыя прафсаюзаў і Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Напрыклад, іхні ўдзел у парлямэнцкіх выбарах 2004 году нельга лічыць чымсьці большым за дэкарацыю, нават у параўнаньні з ФПБ і БРСМ. Апазыцыйныя палітычныя партыі, як прынята лічыць, знаходзяцца па-за межамі палітычнай сыстэмы, па-за межамі дзяржаўнага апарату ўлады і мэханізмаў пераразьмеркаваньня публічных рэсурсаў і ўплыву — фактычна яны дзейнічаюць у іншай палітычнай прасторы, у прасторы ўяўнай «апазыцыйнай палітычнай сыстэмы», быццам бы аддзеленай ад «дзяржаўнай палітычнай сыстэмы» (гэткая бінарная інтэрпрэтацыя беларускага палітычнага жыцьця праглядаецца ў вялікай колькасьці аналітычных матэрыялаў і дасьледаваньняў).

Аднак гэтыя чыньнікі не замінаюць актыўнаму прадукаваньню палітычнай аналітыкі ў форме *публіцыстыкі паліталягічнага кшталту*. У гэтых тэкстах палітычныя партыі апазыцыйнага блёку выступаюць як складнікі суб’екту аб’яднанай-разьяднанай апазыцыі, дзяржаўніцкія ж партыі пазбаўленыя нават гэткай дасьледчыцкай увагі, але яе маюць згаданыя протапартыі як органы дзяржаўнага кіраваньня грамадзка-асацыяванага выгляду — ФПБ, БРСМ, іншыя лябісты і тэрытарыяльна-клянавыя ўтварэньні, што таксама красамоўна сьведчыць пра значэньне праўладных квазіпартыйных утварэньняў. Дадзеная плыня дасьледаваньняў, што ў большасьці прадукуюцца ў коле незалежных аналітыкаў і фабрыкаў думкі, у «незалежнай», гэта значыць, у недзяржаўнай прэсе (у тым ліку і на аналітычных інтэрнэт-рэсурсах), але таксама і ў некаторых дзяржаўных інстытуцыях і мэдыях, нягледзячы на часам вельмі добрую якасьць, пакутуе на адну хібу: большасьць гэтых тэкстаў не арыентаваная на практычнае ўжываньне, мае характар гістарычна-хранікальнага тлумачальнага апісаньня альбо актуальнага інфармацыйнага паведамленьня, а ў горшых сваіх увасабленьнях дадзеныя матэрыялы рэпрэзэнтуюць партыйнае жыцьцё як нізку анэкдотаў і сваркаў партыйных лідэраў у мэладраматычным ключы. Важна адзначыць, што сапраўднае ўнутрыпартыйнае разьвіцьцё, праблемы партыйнага будаўніцтва і працэсы прыняцьця рашэньняў збольшага застаюцца па-за межамі дасьледаваньняў гэткага накірунку — увага тут сканцэнтраваная на зьнешняй актыўнасьці партыяў, удзеле ў палітычным працэсе ці ў спробах уплываць на рэальны палітычны працэс, а пытаньні ўнутрыпартыйнага жыцьця закранаюцца, бадай, толькі ў выпадку пагрозы расколу ў партыі. Палітычная аналітыка гэтага накірунку зьяўляецца непаўнавартаснай, паколькі адпаведны палітычны аналіз не арыентаваны на працэдуру прыняцьця рашэньняў, не вядзе да палітычнага сінтэзу і ў гэтым сьвятле практычна пазбаўлены спажыўнай якасьці.

Другую групу дасьледчых матэрыялаў утвараюць рознага кшталту *практычныя партыйныя дакумэнты*, якія датычацца пераважна ўнутранага абгрунтаваньня асобных партыйных рашэньняў і інтэрпрэтацыі падзеяў ва ўнутрыпартыйным жыцьці. Частка гэтых матэрыялаў недаступная дасьледчыкам (у тым ліку і з-за іх канфідэнцыйнага характару, але часткова з-за згаданай малой увагі дасьледчыкаў да партыйнага жыцьця), а частка ня можа лічыцца дасьледаваньнем і зьяўляецца толькі аб’ектам для дасьледаваньня з-за вялікай ролі суб’ектыўных фактараў пры ўтварэньні гэтых дакумэнтаў (таксама як аб’ектам дасьледаваньня зьяўляюцца праграмныя і ўстаноўчыя дакумэнты, разнастайныя ўхвалы, рэзалюцыі, пратаколы пасяджэньняў і галосныя рашэньні партыйных органаў). У дачыненьні да гэтай плыні матэрыялаў варта адзначыць, што гэтая партыйная ўнутраная

аналітыка часьцей за ўсё робіцца самімі партыйнымі дзеячамі ў бягучым парадку — палітычныя аналітыкі, навукоўцы, спэцыялісты ў пэўных галінах і дасьледчыкі звонку далучаюцца да гэтай працы вельмі рэдка, а тыя з аналітыкаў, якія ёсьць у шэрагах партыі, выступаюць у якасьці заангажаванага інсайдэра (большая частка гэтых матэрыялаў носіць характар вуснага аналітыкагаварэньня падчас разнастайных унутрыпартыйных дыскусіяў і пасяджэньняў, што таксама абмяжоўвае доступ да гэткіх дасьледаваньняў). Але ў гэтых матэрыялах, у адрозьненьне ад іншых, аналізуюцца і, у пэўнай ступені, вывучаюцца практычна ўсе аспэкты партыйнага жыцьця, што спрыяе выкананьню ня толькі функцыі аналізу, але і функцыі сынтэзу (уплыў на працэс прыняцьця рашэньняў унутры партыяў). Напэўна, найбольш пісьменным чынам і на найлепшым па беларускіх мерках узроўні пастаўленая гэтая праца ў Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП), дзе стала дзейнічае своеасаблівы «мазгавы трэст», напрацоўкі якога рэальна выкарыстоўваюцца ў партыйнай стратэгіі і ўплываюць на дзеяньні партыі ў стасунках зь іншымі суб'ектамі палітычнага поля[1].

У той самы час *навуковыя дасьледаваньні* арганізацыйнага разьвіцьця асобных палітычных партыяў, дэталяў кааліцыйнага будаўніцтва і перадвыбарчай тактыкі, фракцыйнага разьмежаваньня і зьмяненьня пэрсанальнага складу кіраўнічых органаў, парадку і працэсу прыняцьця палітычных рашэньняў робяцца ў відавочна недастатковых колькасьцях — варта адзначыць, што найбольш грунтоўныя адмысловыя манаграфіі і зборнікі на гэты конт выходзілі толькі ў пэрыяд шпаркага разьвіцьця шматпартыйнасьці ў Беларусі; да 1999 году асобныя выданьні, прысьвечаныя палітычнаму аналізу партыйнай сыстэмы, зьяўляліся не радзей за некалькі разоў на год, у пазьнейшы пэрыяд падобныя выданьні амаль зьніклі (бібліяграфічныя сьпісы на гэты тэмат звычайна ўзгадваюць у асноўным публікацыі амаль дзесяцігадовай даўніны, датычныя падзеяў 1990-х гадоў). Такім чынам, інстытуцыялізаваная акадэмічная паліталёгія цяпер амаль не выпрацоўвае дасьледаваньняў фактаў рэальнага партыйнага жыцьця альбо робіць гэта толькі фармальна, застаючыся ў лепшым выпадку ў межах прававога падыходу[2]. «Незалежная паліталёгія» (гэта значыць, не зьвязаная зь дзяржаўнымі акадэмічнымі і дасьледчымі цэнтрамі, і ў гэтым сэнсе пэрыфэрыйная навуковая веда пра беларускую палітыку) надае пытаньням партыйнага разьвіцьця параўнальна больш увагі, але гэтыя дасьледаваньні збольшага не трапляюць у шырокі навуковы ўжытак[3]. Практычна, незалежныя навуковыя дасьледаваньні партыяў функцыянальна далучаюцца да дзьвюх папярэдніх групаў матэрыялаў — палітычнай публіцыстыкі-аналітыкі і матэрыялаў, што забясьпечваюць працэс прыняцьця рашэньняў самімі палітычнымі партыямі.

Аглядаючы поле дасьледаваньняў беларускіх палітычных партыяў, варта было б узгадаць іншую групу матэрыялаў: гэта *аналітычна-апаратныя распрацоўкі* такіх дзяржаўных органаў, як Адміністрацыя прэзыдэнта, Камітэт Дзяржаўнай Бясьпекі, у пэўнай ступені Міністэрства юстыцыі і некаторыя іншыя. Зразумела, што гэтыя матэрыялы маюць спэцыфічную скіраванасьць, таксама маладаступныя для сучаных дасьледчыкаў і могуць толькі эвэнтуальна лічыцца навуковым і вартым даверу матэрыялам (узровень заангажаванасьці суб'екта дасьледаваньня ў дадзеным выпадку высокі). Цяжка нават прыблізна ацаніць вартасьці падобнага кшталту дасьледаваньня

1 Частка з аналітычных матэрыялаў гэтай групы даступная на сайце Аб'яднанай грамадзянскай партыі — ucpb.org, які, бясспрэчна, зьяўляецца лепшым партыйным сайтам у by-нэце.

2 Пад «фармальным» характарам дасьледаваньня мы разумеем даволі частае абмежаваньне навукоўцаў канстатацыяй прававых асноваў рэгуляваньня дзейнасьці партыяў, іх статыстыкі (колькасьць партыяў і афіцыйна заяўленая імі колькасьць сябраў, якая звычайна мае мала агульнага з рэчаіснасьцю) і падставовых палажэньняў статуту — гэта найбольш характэрна для дыдактычных курсаў па паліталёгіі і для падручнікаў. Такі падыход, абгрунтаваны ў межах навукова-прававога дасьледаваньня (напрыклад, гл.: Бодак А. Тенденции развития партийного права в Республике Беларусь // Правовой статус политических партий в европейских странах. — Мн., 2003. С. 86–96), ня можа задаволіць палітычную навуку, што выклікае справядлівую незадаволенасьць і ў выкладчыкаў паліталёгіі.

3 Дзеля прыкладу варта назваць выданьне «Политические партии: Беларусь и современный мир» (Мн., 2002). У кніжках, падрыхтаваных менскім Аналітычным грудком, таксама вялікая ўвага надаецца пытаньням партыйнага разьвіцьця (Беларуская палітычная сыстэма і прэзыдэнцкія выбары. — Мн.; Варшава, 2001; Мясцовыя выбары ў найноўшай палітычнай гісторыі Беларусі. — Мн., 2003; Найноўшая гісторыя беларускага парлямэнтарызму. — Мн., 2005). Таксама ўзгадаем шэраг публікацыяў у часопісах «Грамадзянская альтэрнатыва», «Адкрытае грамадства», «Аналитический бюллетень белорусских фабрик мысли». У гэтым сэгмэнце навуковых дасьледаваньняў пераважаюць малатыражныя публікацыі, зьвязаныя з рэалізацыяй праектаў структураў грамадзянскай супольнасьці (напрыклад, вельмі якасны даведачны і гістарычны матэрыял утрымліваецца ў адным з выданьняў з гэтага шэрагу — «Политические партии Беларуси — необходимая часть гражданского общества: материалы семинара» / Авт.-сост. Александр Федута, Олег Богуцкий, Виктор Маринович. — Мн.: Фонд им. Ф. Эберта, 2003. — 113 с.).

няў[4]. Тым ня менш, мы ўпэўненыя, што праз нейкі час і дадзены масіў тэкстаў будзе ўведзены ў навуковы ўжытак і стане грунтоўным матэрыялам для паўнавартасных дасьледаваньняў узаемадзеяньня апазыцыйных палітычных партыяў і структураў аўтарытарнай улады ў Беларусі. Але, бясспрэчна, матэрыялам і тэкстам дадзенай групы нельга адмовіць у іх практычнай скіраванасьці — яны разнастайным чынам забясьпечваюць ажыцьцяўленьне дзяржаўнай палітыкі ў накірунку ўзаемадзеяньня з партыйнымі структурамі, рэальна ўплываюць на стан партыйнай сыстэмы праз ажыцьцяўленьне юрыдычнага кантролю за дзейнасьцю палітычных партыяў і захадаў па абмежаваньні свабодаў дзейнасьці апазыцыйных палітычных партыяў[5].

І нарэшце, па-за межамі гэтай эпістэмалягічнай прасторы палітычнай веды знаходзяцца *сацыялягічныя дасьледаваньні* і разнастайныя вынікі сацыялягічных апытаньняў, якія ў тым ліку робяцца і з мэтай атрыманьня кіраўніцтвам партыяў інфармацыі пра стан партыі ў грамадзтве ў існым палітычным раскладзе. Гэта важная крыніца эмпірычнай інфармацыі пра папулярнасьць партыяў і наступствы розных партыйных крокаў для ўсіх пазначаных дасьледчыцкіх плыняў, але збольшага яна мае характар простага паведамленьня інфармацыі як выніку дасьледаваньня грамадзкай думкі, часам нават зь нявызначанай мэтадалёгіяй альбо з загадзя вядомымі вынікамі, якія павінныя адпавядаць ужо выпрацаванай «інтэрпрэтацыі» альбо ўжо прынятаму палітычнаму рашэньню[6].

Такое мадэляваньне вывучэньня беларускіх партыяў зьяўляецца небясспрэчным, але, з пункту гледжаньня аўтара, яно ў пэўнай ступені адлюстроўвае стан рэчаў у гэтым накірунку палітычных дасьледаваньняў. Відавочна, што ў такой структуры дасьледаваньняў неапраўдана нязначнай выглядае роля ўласна паліталягічных дасьледаваньняў: акрамя трэцяй групы, астатнія пазначаныя намі тэарэтыка-мэтадалягічныя падыходы вельмі часта пераўтвараюцца ў мэтафізычныя альбо спэкулятыўныя дасьледаваньні (з загадзя вызначаным вынікам), яны часьцяком арыентаваныя на дасьледаваньне палітычнага працэсу ўвогуле і збольшага не прызнаюць канкрэтнай беларускай палітычнай партыі за прадмет, варты навуковага дасьледаваньня (таксама як і сацыялягічныя дасьледаваньні беларускіх палітычных партыяў у межах палітычнай сыстэмы збольшага маюць сэрвільны характар, абмежаваны функцыяй складаньня рэйтынгаў, значэньне якіх у адсутнасьці канкурэнтнай электаральнай барацьбы даволі абмежаванае). А між тым, менавіта палітычныя партыі зьяўляюцца клясычным прадметам дасьледаваньняў для палітычнай навукі, з аднаго боку, а вынікі такіх дасьледаваньняў зьяўляюцца каштоўным рэсурсам для актывістаў і кіраўніцтва саміх палітычных партыяў, зь іншага боку, — так, партыі могуць выкарыстоўваць вынікі гэткіх дасьледаваньняў ня толькі ў перадвыбарчай барацьбе і прагназаваньні вынікаў выбараў, але і ў разбудове арганізацыйных структураў партыі і ў іншых сфэрах партыйнага будаўніцтва, у кааліцыйным будаўніцтве, у павышэньні папулярнасьці партыйнай ідэалёгіі, у паляпшэньні працы з актывістамі і ў заахвочваньні новых сымпатызантаў.

Такім чынам, мы лічым, што ў дадзены пэрыяд ад беларускай палітычнай навукі патрабуецца пільная ўвага да пытаньняў дасьледаваньня партыйнага жыцьця як асобнага аб’екту, а менавіта: праблемаў практычнага арганізацыйнага будаўніцтва і пабудовы рэгіянальных структураў, дынамікі партыйнага апарату і асабовага складу партыйцаў, зьменаў у партыйных шэрагах і ратацыяў на кіраўнічых пасадах, падрыхтоўкі і ўдзелу ў электаральных кампаніях з вызначэньнем карэкціроўкі партыйнай стратэгіі пасьля кампаніі, пабудовы рэгіянальных і нацыянальных міжпартыйных кааліцыяў, фракцыйнага разьмежаваньня, схізмаў і плыняў у межах партыяў, працы з мэдыямі, матываваньня партыйных актывістаў і прыхільнікаў, камунікацыяў унутры партыі і камунікацыяў з вонкавым атачэньнем, партыйнай

---

4 Ацэнка і тлумачэньне пэўных сумневаў што да якасьцяў падобнага кшталту дасьледаваньняў зробленая аўтарам у другой частцы артыкулу «Цэнтры цяжару ідэалягічнай працы» (ARCHE, 2004, № 2) па матэрыялах выданьня «Национальная безопасность Республики Беларусь. Современное состояние и перспективы» / Мясникович М. В., Никитенко П. Г., Пузиков В. В. и др. — Мн.: ИООО «Право и экономика». 2003. — 562 с.

5 Напрыклад, зь лістападу 2004 году па чэрвень 2005 году ажыцьцяўлялася кампанія па скарачэньні колькасьці арганізацыйных структураў палітычных партыяў праз забароны іх разьмяшчэньня ў жылых памяшканьнях у кватэрах шматкватэрных жылых дамоў. Падчас грамадзкай дыскусіі, спрэчак і судовых працэсаў па дадзенай праблеме прадстаўнікамі міністэрства юстыцыі цытаваліся разнастайныя ўнутраныя дакумэнты, прысьвечаныя дадзенай праблематыцы.

6 У якасьці прыкладу падобнага кшталту выкарыстаньня сацыялягічных дадзеных прывядзем аналітычнае паведамленьне «Основные заключения — Национальное исследование общественного мнения в Беларуси, июль 2003», зробленае прадстаўнікамі Міжнароднага Рэспубліканскага Інстытуту палітычным партыям Беларусі на падставе сацыялягічнага дасьледаваньня НІСЭПД (прэзэнтавана на Сустрэчы нацыянальных лідэраў «Становішча ў Беларусі» 4–6 верасьня 2003 году). Менавіта гэтае дасьледаваньне і зробленыя паводле яго высновы былі пакладзеныя ў падмурак выпрацоўкі стратэгіі аб’яднаных апазыцыйных партыяў напярэдадні парлямэнцкіх выбараў 2004 году.

псыхалёгіі і канфліктолёгіі, мэханізмаў прыняцьця рашэньняў і інфармацыйна-аналітычнай дзейнасьці партыі. Натуральна, у гэтым накірунку непазьбежна паўстане неабходнасьць вывучэньня піяр-актыўнасьці партыяў падчас электаральных кампаніяў, фінансаваньня партыйнай дзейнасьці і асаблівасьцяў адносінаў зь дзяржаўнымі органамі з улікам спэцыфікі беларускай сытуацыі. Таксама прадуктыўным уяўляецца напрамак дзейнасьці дзеля вывучэньня рэгіянальных партыйных мапаў, што можа вельмі дапамагчы ў практычным сэнсе дзеля складаньня параўнальных пашпартоў акругаў і пабудовы міжпартыйных палітычных кампаніяў на ўзроўні рэгіёнаў. Менавіта гэткае першапачатковае прадметнае поле дазволіць палітычнай навуцы дасягнуць належнага балянсу паміж дынамічнай і статычнай ведай і пераадолець крызу непаразуменьня паміж навукай і практыкай партыйнага будаўніцтва ў Беларусі. На наш погляд, толькі істотнае павелічэньне плыні падобных дасьледаваньняў ак апісальна-аналітычнага, так і стратэгічна-рэкамэндацыйнага характару, дазволіць стварыць навуковы бэкграўнд для эфэктыўнага партыйнага разьвіцьця і дапаможа беларускай партыйнай сыстэме выйсьці на належны ўзровень. Садружнасьць палітычнай навукі і палітычнай (партыйнай) практыкі павінная прывесьці да ўзаемакарысных вынікаў для абодвух суб’ектаў.

Кіруючыся гэтымі тэзамі, аўтар лічыць неабходным працягнуць гэты шэраг дасьледаваньняў вывучэньнем дынамікі разьвіцьця найстарэйшага з суб’ектаў партыйнага поля Беларусі — Партыі БНФ — напярэдадні выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь. Дадзеная спроба дасьледаваньня павінная даць матэрыял для пастаноўкі дасьледчых задачаў больш вузкага накірунку, скіраваных на атрыманьне інфармацыі пра арганізацыйныя магчымасьці гэтай партыі напярэдадні наступных палітычных кампаніяў, пра ўнутрыарганізацыйныя пагрозы і матывацыйныя чыньнікі ў асабовым складзе партыі.

## Партыя БНФ у беларускай палітычнай прасторы

Напэўна, ні для якой зь іншых беларускіх палітычных партыяў ня маюць такога вялікага значэньня пытаньні паходжаньня і фармаваньня партыі. Нягледзячы на тое, што сучасныя сацыял-дэмакратычныя партыі выводзяць сваю генэалёгію ад адраджэнскай Беларускай Сацыялістычнай Грамады пачатку XX стагодзьдзя[7], Камуністычная партыя Беларусі мае рэпутацыю нашчадка паўнаўладнай КПБ як часткі КПСС[8], падобная ж норма фармальна замацаваная і ў праграмных дакумэнтах ПКБ, гэтыя палітычныя партыі могуць разглядацца як простыя нашчадкі сваіх ідэалягічных папярэднікаў толькі ўмоўна[9]. Для партыі ж БНФ перадгісторыя і гісторыя стварэньня руху зьяўляецца па-ранейшаму актуальнай, вызначае характар партыйнай ідэалёгіі, разуменьне ўласнай палітычнай і гістарычнай місіі, імідж партыі ў вачах уладаў і насельніцтва. Ды і сёньняшні пэрсанальны склад партыі (прынамсі, ядро ейных структураў і кіраўнічых органаў) быў у вялікай ступені вызначаны пры яе фармаваньні. Менавіта са стварэньня БНФ «Адраджэньне» ў 1989 годзе для большасьці беларусаў распачаўся пэрыяд легальнай палітычнай альтэрнатыўнасьці. Брэнд «БНФ» зьяўляецца ў беларускай палітычнай мове атаесамленьнем апазыцыйнасьці, дэмакратычнасьці і нацыянальнай сьвядомасьці. Такая передвызначанасьць з боку партыйнай гісторыі накладае свой адбітак на сёньняшняе партыйнае разьвіцьцё, мае як пазытыўныя, так і нэгатыўныя наступствы.

Інстытуцыялізацыі БНФ напрыканцы 1980-х гадоў папярэднічала дзейнасьць гэтак званых «нефармальных аб’яднаньняў» пераважна маладзёвага характару, што існавалі ў Беларусі ў 1980-я гады і ў чыёй дзейнасьці зь цягам перабудовы ўсё гучней адчувалася нота палітычнай барацьбы[10]. Ужо ў 1988 і 1989 гадах папярэднікі

---

7 Пра разьвіцьцё беларускай партыйнай сыстэмы ў першай палове XX стагодзьдзя гл.: «Палітычныя партыі Беларусі» (Мн., 1994).

8 Гл. Статут, праграму і рашэньні Цэнтральнага камітэту Камуністычнай партыі Беларусі.

9 Асобна трэба разглядаць пытаньне пра генэалёгію сучаснай Аб’яднанай грамадзянскай партыі і яе папярэднікаў. Гл.: Володин В. В., Огурцов Е. Е. Гражданская партия, хроника, факты, люди, события. Мн., 2000. Напрыклад, у адной з публікацыяў апошняга часу (Носаў С. Ты памятаеш, як усё пачыналася // ARCHE. 2004, № 5) праводзіцца генэалёгія «Менскі клюб «Сучаснік» — АДПБ — АГП».

10 Гісторыя беларускай палітычнай альтэрнатывы адраджэнскага накірунку, якая адыгрывала вызначальную ролю ў стварэньні Партыі БНФ, адлюстраваная ў двух тамах «Антысавецкія рухі ў Беларусі: 1944–1956» (Мн.: Архіў Найноўшае Гісторыі, 1999) і «Дэмакратычная апазыцыя Беларусі: 1956–1991. Пэрсаналіі і кантэкст» (Мн.: Архіў Найноўшае Гісторыі, 1999). Тут прэзэнтаваныя зьвесткі пра пэрсаналіі, арганізацыі і выданьні, датычныя гэтай тэмы (натуральна, збор фактаў і дакумэнтаў па гэтай праблематыцы працягваецца — гл. публікацыі часопісу «Беларускі Рэзыстанс»). Працэс пераўтварэньня культурніцкіх нефармальных груповак кшталту «Талакі», «Узгор’я», «Беларускай сьпеўна-драматычнай Майстроўні», «Паходні», «Тутэйшых» у палітычныя арганізацыі адлюстраваны ва ўспамінах Алеся Бяляцкага, што друкаваліся ў часопісе «Бюлетэнь Асамблеі НДА» (Дваццаць год таму… // Бюлетэнь Асамблеі НДА. 2002, №№ 2–4; і інш.). У прыватнасьці, у артыкуле А. Бяляцкага «Канспірацыя» (Асамблея. 2004, №№ 6–7) зьмешчаныя праграмныя матэрыялы Беларускай Канспірацыйнай партыі, ідэалягічны ўплыў якіх відавочна адчуваўся ў першай праграме Беларускага Народнага Фронту (пар. «Праграмныя дакумэнты БНФ «Адраджэньне». Мн., 1989. — 38 с.).

БНФ і новастворaны БНФ сьвядома пазыцыяналіся менавіта як радыкальная палітычная альтэрнатыва існаму ладу — гаворка ўжо ішла пра выразную палітычную апазыцыю, нягледзячы на афіцыйна дэкляраваную скіраванасьць «у падтрымку перабудовы». У 1988 годзе агучваньне ў друку Зянонам Пазьняком інфармацыі пра масавыя расстрэлы ў Курапатах часоў сталінскіх рэпрэсіяў ускалыхнула грамадзкасьць, выклікала масавыя дэманстрацыі і прывяло да фармаваньня гістарычна-асьветніцкага таварыства памяці ахвяраў сталінізму «Мартыралёг Беларусі», на базе якога 19 кастрычніка 1988 году быў створаны аргкамітэт БНФ «Адраджэньне». У чэрвені 1989 году ў Вільні адбыўся першы (устаноўчы) зьезд Беларускага Народнага Фронту за перабудову «Адраджэньне», на якім была зацьверджаная праграма і статут новага грамадзка-палітычнага руху. Нягледзячы на тое, што першапачаткова БНФ не сьцьвярджаў сябе партыяй, ягоныя праграмныя дакумэнты мелі выразны характар палітычнага праекту (адзначалася важнасьць удзелу сілаў БНФ у бліжэйшых выбарах у Вярхоўны Савет і ў мясцовыя саветы), а асноўныя элемэнты гэтай праграмы захаваліся і ў сёньняшняй ідэалёгіі партыі: незалежнасьць Беларусі як вышэйшая каштоўнасьць (ня выкладзены літаральна ў першай праграме, дух гэтага прынцыпу тым ня менш быў тут выразна акцэнтаваны), пабудова дэмакратычнага і гуманістычнага грамадзтва ў адпаведнасьці з прынцыпамі правоў чалавека і сацыяльнай справядлівасьці, патрыятызм і павага да нацыянальнай спадчыны і беларускай мовы. Старшынёй арганізацыі на ўстаноўчым зьезьдзе быў абраны Зянон Пазьняк.

Актыўная дзейнасьць БНФ у 1989–1990 гадах і харызма ейнага лідэра, разгубленасьць старой намэнклятурна-камуністычнай эліты, спрыяльнае вонкавае асяродзьдзе (працэсы радыкальных пераўтварэньняў у Савецкім Саюзе) забясьпечылі першыя посьпехі новага руху: праўда пра наступствы Чарнобыльскай катастрофы і пра падзеі ў Курапатах была выкрытая і зрабілася прадметам публічнай дыскусіі — прынамсі, улады больш не маглі безапэляцыйна адмаўляць існаваньне гэтых праблемаў і былі вымушаныя лічыцца з новай палітычнай сілай, былі зробленыя захады па ўсталяваньні палітычнага плюралізму. На хвалі гэтых посьпехаў на выбарах у 1990 годзе БНФ, нягледзячы на супраціў адміністрацыі і кампартыі, а таксама нягледзячы на існаваньне *de jure* аднапартыйнай сыстэмы, здолеў дамагчыся посьпеху. Сябры БНФ атрымалі некалькі дэпутацкіх мандатаў, а пазьней да фракцыі БНФ далучыліся і іншыя дэпутаты — колькасьць апазыцыі БНФ сягала да 37 з 360 месцаў у Вярхоўным Савеце Беларусі 12-га скліканьня (па пэўных пытаньнях да апазыцыі далучаліся да 100 дэпутатаў дэмакратычнай арыентацыі). БНФ таксама забясьпечыў прадстаўніцтва ў мясцовых Саветах дэпутатаў. Трэба заўважыць, што па тагачаснай выбарчай сыстэме кандыдаты ад руху БНФ кваліфікаваліся як «беспартыйныя», часам Фронт выказваўся ў падтрымку кандыдатаў і ад іншых палітычных сілаў. У Вярхоўным Савеце была сфармаваная Апазыцыя БНФ, якая паказала сябе моцнай і згуртаванай сілай, здольнай пераадолець супраціў камуністычна-намэнклятурнай большасьці і праводзіць уласную палітычную лінію. Менавіта дзейнасьць гэтай фракцыі спрыяла абвяшчэньню спачатку сувэрэнітэту, а пазьней і незалежнасьці Беларусі, аднаўленьню нацыянальнай сымболікі, прыпыненьню дзейнасьці Камуністычнай партыі Беларусі, спрыяла дэмакратызацыі грамадзтва — па ўсіх гэтых пытаньнях, асабліва ў 1991 годзе, пазыцыя парлямэнцкай фракцыі БНФ была вырашальная. Праца парлямэнцкай фракцыі паказала здольнасьць руху БНФ да паўнавартаснай партыйнай дзейнасьці, падрыхтавала стварэньне прафэсійнай і згуртаванай палітычнай партыі БНФ. Аднак ужо ў 1992 годзе БНФ зазнае першыя паразы, зьвязаныя са спробай ініцыяваньня роспуску Вярхоўнага Савету і датэрміновымі выбарамі: для ўсіх было відавочна, што такім чынам БНФ магла б істотна павялічыць сваё прадстаўніцтва ў парлямэнце і нават здабыць там аднаасобную большасьць, аднак маўклівая бальшыня парлямэнту здолела незаконным чынам заблякаваць гэтую ініцыятыву, нягледзячы на сабраныя на яе карысьць 450 тысячаў подпісаў грамадзянаў Беларусі. Паводле меркаваньняў некаторых назіральнікаў, гэта быў пераломны момант беларускай гісторыі («кропка біфуркацыі»), пачынаючы зь якой працэс дэмакратызацыі спыняецца; у студзені 1994 году з пасады кіраўніка Вярхоўнага Савету адхіляюць Станіслава Шушкевіча — пачынае ўзыходзіць зорка Аляксандра Лукашэнкі, на якога зрабіла стаўку частка беларускай эліты.

У гэтыя часы ў выніку «сяброўскага» разыходжаньня з БНФ — гэта быў не раскол, а сьвядомая палітыка кіраўніцтва БНФ дзеля штучнага фармаваньня партыйнай прасторы — утварылася Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Грамада (сучасныя ейныя ідэалягічныя і арганізацыйныя нашчадкі — БСДГ і БСДП «НГ»). Існаваў шэраг несамастойных афіліраваных з рухам БНФ партыяў і рухаў (Хрысьціянска-дэмакратычная злучнасьць, Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі,

Беларуская нацыянальная партыя, у пэўнай ступені Беларуская сялянская партыя), якія мелі розную ступень абмежаванай аўтаноміі і пазьней, зь перарэгістрацыямі 1994 і 1999 гадоў, спынілі сваё існаваньне. Па пэрсанальным складзе гэтыя арганізацыі фармаваліся за кошт дзейсных альбо былых актывістаў БНФ — было пашыранае меркаваньне, што БНФ мусіць выконваць функцыю аб'яднаньня ўсіх нацыянальна-дэмакратычных сілаў, мець характар шырокага надпартыйнага грамадзкага руху. Юрыдычна БНФ не зьяўляўся партыяй, хоць і меў пэўнае прадстаўніцтва і ўплыў у парлямэнце і мясцовых органах улады, дэкляраваў палітычныя мэты. Праўнае афармленьне БНФ як партыі з адначасовым захаваньнем Грамадзкага аб'яднаньня БНФ «Адраджэньне» адбылося ў 1993 годзе. Меркавалася, што партыя БНФ будзе існаваць як палітычная сіла падчас выбарчых кампаніяў, у пэрыяд паміж якімі будзе дзейнічаць грамадзкае аб'яднаньне. Аднак з узмацненьнем палітычнага ціску, адваротнай радыкалізацыяй апазыцыі і фармаваньнем прэзыдэнцкага палітычнага ладу роля БНФ як шырокага грамадзкага руху памяншаецца, ён пераўтвараецца па арганізацыйным характары ў шараговую палітычную партыю зь вялікім мінулым; падзеі 1996–2001 гадоў і ўзмацненьне ўлады прэзыдэнта Лукашэнкі паглыбілі гэтую тэндэнцыю. Роля апірышча нацыянальна-культурнага адраджэньня зараз выконваецца БНФ праз дасягненьне палітычных мэтаў і празь нефармальнае ідэалягічнае дамінаваньне на гэтым сэгмэнце, асабліва ў асяродзьдзі структураў грамадзянскай супольнасьці. Зараз партыя і грамадзкае аб'яднаньне, у арганізацыйным сэнсе адзіныя, у юрыдычным сэнсе зьяўляюцца аўтаномнымі юрыдычнымі асобамі, але як самастойны суб'ект і цэнтр прыняцьця рашэньняў існуе толькі партыя.

У 1994 годзе пазыцыя Партыі БНФ у дачыненьні да прыняцьця канстытуцыі, што прадугледжвала ўвядзеньне пасады прэзыдэнта, не была пасьлядоўнай. Партыя не выступала за ўвядзеньне пасады прэзыдэнта, але лідэр партыі Зянон Пазьняк у выпадку правядзеньня ўсенародных выбараў прэзыдэнта разьлічваў на перамогу — як зараз бачна, беспадстаўна: кандыдат ад Партыі БНФ на прэзыдэнцкіх выбарах улетку 1994 году атрымаў 12,8% галасоў выбаршчыкаў, заняў трэцяе месца і не патрапіў у другі тур. Прэзыдэнтам быў абраны Аляксандар Лукашэнка, і вельмі хутка палітычны працэс выйшаў з рэчышча звычайнай сыстэмнай палітычнай барацьбы, набыў рысы змаганьня за існаваньне дэмакратычнай і канстытуцыйнай рэспублікі. Абвяшчэньне прэзыдэнтам увесну 1995 году рэфэрэндуму сталася для БНФ абразай — пытаньні пра правы прэзыдэнта на роспуск парлямэнту і пра эканамічную інтэграцыю з Расеяй былі эмацыянальна падкрэсьленыя прынцыповымі для руху БНФ пытаньнямі пра статус беларускай мовы і дзяржаўную сымболіку. Руйнаваліся асноўныя здабыткі перамогаў пачатку 1990-х. У знак пратэсту супраць руйнаваньня канстытуцыйнага ладу 18 дэпутатаў дэмакратычнай апазыцыі ў Вярхоўным Савеце проста ў залі пасяджэньняў абвесьцілі галадоўку, якая была гвалтоўна прыпыненая спэцпадразьдзяленьнямі.

Фармаваньне Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня ажыцьцяўлялася пры дапамозе давыбараў — зь першага разу не было абрана неабходнай колькасьці дэпутатаў, і некаторы час Вярхоўны Савет працаваў у складзе дэпутатаў 12-га скліканьня. Нарэшце ў студзені 1996 году правамоцны склад новага парлямэнту быў абраны, але ніводзін з прадстаўнікоў БНФ туды не патрапіў, таму роля парлямэнцкай апазыцыі перайшла да іншых сілаў[11]. Увесну 1996 году ўжо пазапарлямэнцкі БНФ стаў галоўным рухавіком масавых акцыяў пратэсту, відавочна вяртаючыся да вулічных спосабаў барацьбы, як гэта было ўжо напачатку 1990-х. Аднак гэтым разам падобная тактыка не прывяла да нейкіх посьпехаў, хоць у далейшым менавіта Партыя БНФ і ейнае маладзёвае крыло «Малады Фронт» сталіся лідэрамі ў галіне арганізацыі масавых мітынгаў і дэманстрацыяў. Канстытуцыйны пераварот і рэфэрэндум увосені 1996 году засьпелі ПБНФ ужо ў стане пазасыстэмнай апазыцыі, хоць уплыў партыі на грамадзкую сьвядомасьць заставаўся яшчэ высокі. Таксама са знакавых падзеяў тагачаснага партыйнага жыцьця трэба адзначыць палітычную эміграцыю харызматычнгага лідэра Партыі БНФ Зянона Пазьняка, якая, па ацэнках некаторых дасьледчыкаў, сапраўды была вымушанай. Гэтая падзея надоўга пазбавіла партыю кіраўніка і спрыяла стагнацыі, страце папулярнасьці і сыходу вялікай колькасьці прыхільнікаў, пагражала яе пераходам у маргіналізаваны стан[12].

У палітычных баталіях 1997–1999 гадоў партыя БНФ прымала актыўны ўдзел, але не была

[11] Аднак трэба заўважыць, што ў цэлым па Беларусі за кандыдатаў ад БНФ было пададзена 10% галасоў выбаршчыкаў, што ёсьць прыкметай моцнай апазыцыйнай партыі. — Гл.: Беларуская палітычная сыстэма і прэзыдэнцкія выбары. — Мн.; Варшава, 2001. С. 402–403.

[12] Падрабязьней пра гісторыю ПБНФ да 1997 году гл.: Астрыд Зам. Беларускі нацыяналізм ці нацыяналізм Беларусі? // Беларускі гістарычны агляд. 1998, № 7. С. 69–96.

лякаматывам супраціву альбо вырашальнай сілай у палітычнай барацьбе: асноўную ролю ў палітычнай апазыцыі сталі адыгрываць дзеячы распушчанага Вярхоўнага Савету 13-га склікаthroughньня, партыя АГП, а пазьней нават непартыйныя структуры кшталту «Хартыі-97», у той час як ПБНФ, хоць і зьяўлялася важным складнікам апазыцыйных сілаў, страціла былую вагу на палітычным полі. ПБНФ была па-за канкурэнцыяй толькі ў галіне арганізацыі масавых акцыяў пратэсту, паступова саступаючы АГП у міжнародных кантактах і ў рэалізацыі ўласных палітычных праектаў. Падзеі вакол непрызнаньня сфармаванай Лукашэнкам Палаты прадстаўнікоў, альтэрнатыўныя прэзыдэнцкія выбары 1999 году, байкот мясцовых выбараў 1999 году і парлямэнцкіх выбараў 2000 году адбываліся, безумоўна, з удзелам ПБНФ, меркаваньні партыі ўлічваліся пры выпрацоўцы рашэньняў, аднак збольшага актывісты партыі адчувалі сябе часткай гульні, якую вялі іншыя палітычныя акторы, лідэры Вярхоўнага Савету. ПБНФ прымала ўдзел у стварэньні і працы Кансультатыўнай рады апазыцыйных палітычных партыяў і Каардынацыйнай рады дэмакратычных сілаў і грала там другую скрыпку пасьля АГП.

Асноўнай падзеяй партыйнага жыцьця ў гэты пэрыяд стала барацьба за адхіленьне ад кіраўніцтва Зянона Пазьняка, які імкнуўся кіраваць партыяй з выгнаньня. У папярэдні пэрыяд БНФ быў партыяй, арыентаванай на моцную постаць свайго харызматычнага правадыра, аднак ва ўмовах эміграцыі лідэра партыя апынулася ў глыбокім крызысе, страціла і маральны дух, і папулярнасьць, з-за ўпартасьці лідэра не давала згоды на некаторыя палітычныя кампрамісы. У выніку працяглай кулюарнай барацьбы на VI Зьезьдзе БНФ «Адраджэньне» быў абраны новы старшыня ПБНФ Вінцук Вячорка, зь ім прыйшла група амбітных лідэраў, частка партыйнага кіраўніцтва і частка сябраў партыі ў знак пратэсту пакінула шэрагі БНФ і стварыла ўласную арганізацыю КХП-БНФ на чале зь Зянонам Пазьняком (неўзабаве падчас судовага працэсу было прызнана, што частка, якая адкалолася, ня мае правоў на назву «БНФ»). Супрацьстаяньне ПБНФ і КХП-БНФ, хоць і не такое радыкальнае, як у часы расколу, і зараз зьяўляецца адчувальным фактарам унутрыпартыйнага жыцьця — нязначныя ідэалягічныя разыходжаньні і пэўнае перакрыжаваньне сымпатыкаў абедзьвюх партыяў, даўнія, але недаравальныя асабістыя крыўды і кепская дыфэрэнцыяцыя ў шырокім непалітызаваным грамадзтве ствараюць умовы для працягу зьнешняй канфрантацыі і пэрыядычных канфліктаў унутры ПБНФ.

Як бы там ні было, падрыхтоўка да прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году і самі выбары былі сустрэтыя партыяй у абноўленым стане — раскол можна ў пэўнай ступені назваць санацыяй партыі, хоць нэгатыўныя наступствы ў выглядзе сапсаванага іміджу, страты папулярнасьці і наяўнасьці непажаданага «двайніка» — КХП-БНФ — будуць адчувацца яшчэ доўга (пытаньне пра неабходнасьць збліжэньня ПБНФ з КХП-БНФ пэрманэнтна паўстае падчас унутрыпартыйных дыскусіяў, але зьяўляецца для сёньняшняга кіраўніцтва гэтых партыяў раз і назаўжды вырашаным). Тым ня менш актывісты ПБНФ адыгрывалі важную ролю ва ўсіх складніках кампаніі аб’яднанай апазыцыі на прэзыдэнцкіх выбарах 2001 году (агітацыя і збор подпісаў, мабілізацыйная кампанія, назіраньне, праца штабоў). Абсалютная большасьць сябраў партыі і партыйнае кіраўніцтва выступалі ў падтрымку кандыдатуры Сямёна Домаша, які найбольш адпавядаў прынцыпам ПБНФ. Таму ўвесь шараговы склад партыі быў шакаваны, калі адзіным апазыцыйным кандыдатам быў вызначаны Уладзімір Ганчарык — шмат дзе ў рэгіёнах актывісты партыі папросту спынілі працу з насельніцтвам альбо сталі ставіцца да яе фармальна, бо не маглі пагадзіцца працаваць у межах «саюзу намэнклятуры з нацыяналістамі» і лічылі такое рашэньне партыйнага кіраўніцтва ня проста здрадай партыйным ідэалам, але і неапраўданым у палітычным сэнсе крокам да фіяска на выбарах (не сакрэт, што кандыдатура Ганчарыка лябіявалася збольшага зьнешнімі палітычнымі акторамі, пры гэтым партыі былі даволі аддаленыя ад мэханізму вызначэньня адзінага апазыцыйнага кандыдата і выступалі ў гэтым працэсе назіральнікамі). Партыя БНФ цяжка перажыла паразу апазыцыі на тых выбарах менавіта яшчэ і таму, што ў гэтай барацьбе яны пацярпелі паразу, нават не выстаўляючы кандыдата, які б адпавядаў партыйнай ідэалёгіі — гэта была маральная параза. Трэба адзначыць, што ў гэты час Партыя БНФ губляе ўплыў на зьнешнепалітычнай арэне, перастае быць галоўным стрыжнем беларускай апазыцыі ў вачах замежных партнэраў.

Такім чынам, гісторыя Партыі БНФ вызначае важныя адметнасьці партыйнай палітыкі. Назва і спадчына шмат да чаго абавязваюць, але сёньняшняе кіраўніцтва Партыі БНФ здолела творчым чынам разьвіць спадчыну нацыянальна-адраджэнскага руху 1980–90-х гадоў і, захаваўшы прынцыпы і фундамэнтальныя ідэалягічныя пачаткі беларускага Адраджэньня, пазьбегнуць пераўтварэньня ў скамянелую і нягнуткую структуру. Падставовыя прынцыпы не зьмяніць, але гнуткасьць па пытаньнях тактычных дазволіла цяпер Партыі

БНФ заняць пазыцыі лідэраў апазыцыйнага да рэжыму Лукашэнкі блёку і пры гэтым прыняць удзел у стварэньні шырокай дэмакратычнай кааліцыі міжпартыйнага характару. Менавіта гістарычная спадчына руху БНФ «Адраджэньне» вызначае партыйную самасьвядомасьць і ідэалёгію, а таксама пазыцыянуе ПБНФ у вачах іншых суб’ектаў палітычнага поля і грамадзянаў.

У пэўным сэнсе падобнае вызначанае палітычнае крэда перашкаджае партыі. Захаваўшы ідэалягічную сувязь са сваімі каранямі, партыя БНФ, прынамсі, у асобе часткі партыйнага кіраўніцтва, адчувае некаторую абцяжаранасьць спадчынай палітычных паразаў, якая ўтварылася ў партыі БНФ у апошняе дзесяцігодзьдзе. Думка пра зьмену партыйнай назвы актыўна абмяркоўвалася ва ўнутрыпартыйных дыскусіях да 2003 году: пазытыўным вынікам падобнага кроку была б санацыя іміджу партыі ад нэгатыву, зьвязанага са згаданымі паразамі, зь вялікім нэгатыўным рэйтынгам асобы колішняга правадыра партыі Зянона Пазьняка, з наступствамі шматгадовай нэгатыўнай кампаніі супраць партыі ў дзяржаўных і кантраляваных дзяржавай мэдыях. Тым ня менш, зараз гэтае пытаньне не стаіць на будзённым парадку дня, паколькі адмоўныя моманты падобнай зьмены назвы значна перавышаюць магчымыя выгоды: зараз брэнд «БНФ» зьяўляецца гістарычнай каштоўнасьцю і гарантыяй таго, што дадзеная партыя ніколі не адыйдзе ад пазыцыяў нацыянальнага Адраджэньня і дэмакратыі; менавіта значнасьць гэтай назвы накладае на партыйцаў вялікія абавязкі і прымушае ўлады па-асабліваму ставіцца да гэтай арганізацыі — напрыклад, юрыдычная ліквідацыя Партыі БНФ раўназначная забароне шматпартыйнасьці ў Беларусі; памяняўшы назву, Партыя БНФ непазьбежна пераўтварылася б у шараговую апазыцыйную партыю і імгненна згубіла б вялікі адсотак папулярнасьці — дамагчыся падобнага індэксу вядомасьці ў сёньняшняй мэдыйнай сытуацыі і пры сёньняшніх рэсурсах для новага брэнду было б вельмі цяжка.

Такім чынам, зараз Партыя БНФ заснаваная на трывалых ідэалягічных прынцыпах, якія зьяўляюцца нязьменнымі, нягледзячы на здольнасьць партыі да тактычных кампрамісаў зь іншымі палітычнымі партыямі, якія вызнаюць каштоўнасьці дэмакратыі і незалежнасьці Беларусі. Непахісная арыентацыя на нацыянальна-культурнае Адраджэньне ня ёсьць перашкодай для супрацы з тымі палітычнымі сіламі, для якіх гэткі фэномэн не зьяўляецца звышкаштоўнасьцю. ПБНФ усьведамляе, што нацыянальнае Адраджэньне магчымае толькі пры ўмове дэмакратызацыі Беларусі. Адначасова Партыя БНФ ёсьць прамым нашчадкам нацыянальна-адраджэнскага руху 1980–1990-х, і гэткія карані выклікаюць як пазытыўныя (яснае пазыцыянаваньне партыі і зразумелая ідэалёгія, добрая пазнавальнасьць і вядомасьць, трывалы корпус перакананых актывістаў і дастаткова вялікая колькасьць сьвядомых прыхільнікаў, што не зьяўляюцца сябрамі партыі, дастаткова моцная сетка рэгіянальных структураў зарэгістраванага і незарэгістраванага ўзроўню), так і нэгатыўныя наступствы (вялікі нэгатыўны рэйтынг, састарэласьць і звыкласьць брэнду, імідж радыкалаў-няўдачнікаў, якія «заўсёды ў апазыцыі», малая актуальнасьць некаторых праграмных палажэньняў). Партыя БНФ зараз застаецца моцным палітычным актарам і адным з асноўных элемэнтаў палітычнай апазыцыі.

## Партыйнае будаўніцтва ў пэрыяд 2001–2003 гадоў

Параза апазыцыйных сілаў на выбарах прэзыдэнта ў 2001 годзе абумовіла пачатак новага пэрыяду партыйнага разьвіцьця як для ПБНФ, так і для іншых апазыцыйных палітычных партыяў. Асэнсаваньне прычынаў няўдачы і разуменьне патрэбы павелічэньня ролі партыяў у апазыцыі вызначылі асаблівасьці стратэгіі ПБНФ на наступны пэрыяд і, відавочна, патрабавалі зьменаў унутры партыі — для Партыі БНФ гэта была выпрацоўка новых стратэгіяў, а таксама пэўная ратацыя партыйнага кіраўніцтва і пакліканьне новай генэрацыі партыйных лідэраў[13]. Таксама для пэрыяду партыйнага жыцьця канца 2001–2003 гадоў характэрны ўплыў наступных чыньнікаў: узмацненьне палітычных рэпрэсіяў і зьвязанае з гэтым абмежаваньне легальных магчымасьцяў для палітычнай барацьбы; павелічэньне ўплыву пазыцыі замежных актараў на міжпартыйныя стасункі і ўзрастаньне важнасьці пазыцыянаваньня адзінства апазыцыйных сілаў на зьнешнім полі; заняпад і фактыч-

[13] Выглядае слушнай тэза Віталя Сіліцкага пра тое, што пэрыяд 2001–2003 гадоў быў скарыстаны апазыцыяй не дзеля дасягненьня сваіх мэтаў, а дзеля прыстасаваньня да новых умоваў і барацьбы за выжываньне (Сіліцкі В. Крызыс апазыцыі пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году // Мясцовыя выбары ў найноўшай гісторыі Беларусі. — Мн., 2003. С. 104–130). Аднак нам падаецца, што ў дадзеным выпадку ўнутраныя зьмены ў апазыцыйных партыях ня варта ацэньваць толькі нэгатыўна: напрыклад, пасьля шэрагу ўнутраных перабудоваў ПБНФ прыйшла да выбараў больш згуртаванай арганізацыяй, больш нацэленай на свае мэты ў існых варунках і… зь меншаю колькасьцю актыўных сябраў. Зразумела, што гэта было прыстасаваньнем да сытуацыі, аднак бяз гэткага прыстасаваньня партыя была б увогуле паралізаваная і пазбаўленая магчымасьцяў рэальнай палітычнай дзейнасьці. Менавіта пасьля прэзыдэнцкіх выбараў палітычныя партыі зрабіліся асноўным рухавіком апазыцыі, і наступныя мясцовыя выбары паказалі эфэктыўнасьць гэткай тактыкі.

нае прыпыненьне расейска-беларускага інтэграцыйнага праекту зь пераходам Лукашэнкі да рыторыкі абароны сувэрэнітэту з адначасовым умацаваньнем асабістай улады; прыход да ўдзелу ў публічнай палітыцы новай хвалі актывістаў, арыентацыя на непасрэдную працу з насельніцтвам ва ўмовах недаступнасьці легальных каналаў перадачы інфармацыі і дэлегалізацыі структураў грамадзянскай супольнасьці. Таксама гэты пэрыяд быў адзначаны заняпадам ранейшых аб'яднаўча-кааліцыйных структураў у асяродзьдзі апазыцыі — Каардынацыйная рада апазыцыйных палітычных партыяў і Каардынацыйная рада дэмакратычных сілаў зрабіліся недзеяздольнымі і фактычна распаліся. На месцы, якое раней займалі гэтыя структуры, быў распачаты працэс пабудовы надпартыйных кааліцыяў. Для ПБНФ своеасаблівым катарсысам пасьля паразы на выбарах сталася абарона нацыянальнага нэкропалю ў Курапатах, на месцы масавых расстрэлаў, — гэта было вяртаньне да вытокаў нацыянальна-адраджэнскай барацьбы з атрыманьнем глытка посьпеху для новай палітычнай дзейнасьці.

У сьнежні 2001 году на VII Зьезьдзе БНФ «Адраджэньне» (V Зьезд Партыі БНФ) былі падведзеныя вынікі выбараў 2001 году, і, нягледзячы на вострыя і крытычныя дыскусіі, быў выказаны давер існаму партыйнаму кіраўніцтву. Шмат хто з выступоўцаў на зьезьдзе наракаў на памылкі партыйнага кіраўніцтва падчас прэзыдэнцкіх выбараў — здача кандыдатуры Сямёна Домаша пад ціскам зьнешніх дарадцаў і хаўрус з намэнклятурнай апазыцыяй, слабая сувязь з рэгіёнамі і кепская арганізацыя цэнтральнага штабу, іншыя хібы. Аднак большасьць дэлегатаў зьезду падтрымала лідэра партыі Вінцука Вячорку, які быў зноў перабраны на пасаду старшыні партыі. Як альтэрнатыўная кандыдатура вылучыўся Вячаслаў Сіўчык, але ён набраў толькі каля чвэрці галасоў дэлегатаў партыйнага зьезду (81 голас з 327 магчымых). У той жа час у складзе кіроўнага органу партыі — Сойму — адбылася пэўная ратацыя кадраў, была ўлітая порцыя «сьвежай крыві» маладых лідэраў зь беларускіх рэгіёнаў, часта зьвязаных з «трэцім сэктарам» (менавіта ў сэгмэнце грамадзянскай супольнасьці палітычная актыўнасьць можа быць рэалізаваная безь небясьпекі ціску па месцы працы — насуперак працаўладкаваньню ў дзяржаўных альбо прыватных структурах; «трэці сэктар» ёсьць крыніцай кваліфікаваных кадраў для партыі). Таксама быў зьменены і склад намесьнікаў старшыні партыі, колькасьць якіх была скарочаная з шасьці да чатырох чалавек. Пасаду намесьнікаў старшыні захавалі лідэр «Маладога Фронту» Павал Севярынец, рэдактар газэты «Рабочы» Віктар Івашкевіч, прафэсар Юры Хадыка. Таксама на пасаду намесьніка была абраная кіраўнік юрыдычнай камісіі партыі Галіна Сямдзянава. У склад намесьнікаў не патрапіў Вячаслаў Сіўчык, які займаў гэтую пасаду раней, — згодна з унутрыпартыйнымі нормамі, дзеля забесьпячэньня адзінства «кіраўнічага кабінэту» і, напэўна, на шкоду прынцыпам дэмакратычнасьці, асоба, якая вылучалася на пасаду старшыні і не была падтрыманая Зьездам, ня можа балятавацца на намесьніка. Таксама ў выніку галасаваньня па кандыдатурах намесьнікаў старшыні не набралі неабходную колькасьць галасоў кіраўнік камісіі партыйнага навучаньня Аляксей Янукевіч і кіраўнік Магілёўскай абласной арганізацыі партыі Анатоль Фёдараў. Гэта быў зьезд тых, хто прайграў на прэзыдэнцкіх выбарах, і згаданыя кадравыя перастаноўкі былі неабходныя як аздараўленьне партыі дзеля далейшай эфэктыўнай дзейнасьці. Аднак падаецца, што паміж прынцыпамі кадравай стабільнасьці і ўліваньня новай крыві ўсё ж такі быў зроблены выбар на карысьць прынцыпу «старыны ня рушыць» — маладая генэрацыя, якая прайшла школу нацыянальнай выбарчай кампаніі і грамадзянскага мэнэджмэнту ў структурах «трэцяга сэктару», ужо была гатовая да рэалізацыі ўласных палітычных амбіцыяў у ходзе палітычных кампаніяў, але яшчэ не была дастаткова загартаваная, каб замяніць ранейшае дасьведчанае кіраўніцтва ва ўнутранай канкурэнцыі ў асяродзьдзі апазыцыйных палітычных партыяў. Такім чынам, кадравая ратацыя не была такой радыкальнай, якой яна магла б быць. Пазьней слушнасьць падобнай кадравай палітыкі была спраўджаная падчас мясцовых выбараў 2003 году. Адзначым таксама, што пасьля гэтага зьезду ў 2002 годзе некалькі вядомых асобаў пакінулі шэрагі партыі — быў выключаны кіраўнік Менскай абласной арганізацыі БНФ Валянцін Баранаў, а былы старшыня Гарадзенскай абласной арганізацыі Мікола Баўсюк быў спачатку адхілены ад пасады старшыні, а пазьней выйшаў з партыі.

У сьнежні 2002 году адбыўся пазачарговы VIII Зьезд БНФ «Адраджэньне» (VI Зьезд Партыі БНФ). Гэты зьезд не насіў характару справаздачна-выбарнага — пытаньне выбараў кіраўнічых органаў партыі на ім ня ставілася. Зьезд быў прысьвечаны ўнясеньню зьменаў у статутныя і праграмныя дакумэнты партыі. Сярод унесеных у Статут Партыі БНФ зьменаў варта адзначыць забарону сябрам ПБНФ быць сябрамі іншых палітычных партыяў і зьмяненьне парадку ўтварэньня арганізацыйных структураў партыі — быў замацаваны дазвол на ўтварэньне партыйных структураў бяз права юрыдычнай асобы (раней гэта не

было прадугледжана, што абмяжоўвала магчымасьці партыі ў пашырэньні сеткі рэгіянальных структураў). На зьезьдзе была пастаўленая задача дамагчыся як мага большай зарэгістраванасьці партыйных структураў, паколькі толькі наяўнасьць зарэгістраваных філіяў партыі дазваляла рабіць вылучэньне кандыдатаў падчас парлямэнцкіх і мясцовых выбараў.

Але гэты зьезд быў ня толькі тэхнічны — ён таксама выконваў важную праграмную функцыю. На зьезьдзе была прынятая і ўхваленая новая Праграма БНФ «Адраджэньне», якая больш адпавядала існым палітычным рэаліям. Гэтая праграма стала трэцім з тых праграмных дакумэнтаў БНФ, якія пазначаюць этапы ў разьвіцьці сучаснага беларускага грамадзтва. Першы праграмны дакумэнт Беларускага Народнага Фронту быў прыняты ў 1989 годзе і адпавядаў тагачасным гістарычным задачам, што стаялі перад беларускай нацыяй, — рэалізацыя права на нацыянальнае самавызначэньне, здабыцьцё сувэрэнітэту і дзяржаўнай незалежнасьці, адраджэньне культуры і мовы, вырашэньне праблемаў Чарнобылю, пабудова грамадзтва на прынцыпах сацыяльнай справядлівасьці, дэмакратыі і павагі да правоў чалавека. Можна сказаць, што фундамэнтальны з пунктаў той праграмы — нацыянальны і дзяржаўны сувэрэнітэт — быў у значнай ступені рэалізаваны, гэтаксама як адбыліся адчувальныя зрухі і ў іншых заяўленых у праграме накірунках. Напэўна, праграма БНФ часоў «перабудовы» была выкананая. Напачатку 1990-х перад рухам стаяла задача выпрацоўкі праграмы дзейнасьці ва ўмовах незалежнай Беларусі. Гэта было ўвасоблена ў стварэньні Партыі БНФ і прыняцьці праграмы ў рэдакцыі 1993 году (менавіта з таго часу, згодна са статутам Партыі БНФ, праграмай Партыі БНФ зьяўляецца праграма Грамадзкага аб’яднаньня БНФ «Адраджэньне»). Гэтаму дакумэнту, які прымаўся ў часы адноснай лібэралізацыі грамадзтва, было наканавана быць праграмным дакумэнтам партыі ад часу яе лідэрскіх пазыцыяў на плюралістычнай палітычнай арэне ў момант прыняцьця праграмы да часоў умацаваньня партыі ў якасьці радыкальнай і прынцыповай апазыцыі да кіроўнага аўтарытарнага рэжыму ў 2002 годзе, калі нарэшце праграма была зьмененая. Трэба канстатаваць, што праграма 1993 году не была выкананая, партыя ня здолела дамагчыся рэальнай улады, без чаго была немагчыма яе рэалізацыя[14]. Прынятая ў 2002 годзе праграма была адметная больш прадметнай і глыбокай прапрацоўкай пытаньняў будучага дзяржаўнага будаўніцтва, а таксама скасоўвала найбольш адыёзныя і спрэчныя пункты старой праграмы БНФ (кшталту залежнасьці грамадзянскіх правоў ад выкананьня грамадзянскіх абавязкаў альбо зацьвярджэньня парлямэнтам вышэйшых кіраўнікоў рэлігійных канфэсіяў). У цэлым новая рэдакцыя праграмы набліжала Партыю БНФ да цэнтру палітычнага спэктру, пазыцыянавала партыю ў якасьці сучаснай правацэнтрысцкай партыі ў агульнаэўрапейскім стылі.

У зьвязку з мадэрнізацыяй праграмы Партыі БНФ неабходна адзначыць, што да 2002 году ПБНФ і КХП-БНФ мелі агульны праграмны дакумэнт у выглядзе Праграмы БНФ «Адраджэньне» ў рэдакцыі 1993 году. З 2002 году гэтае дзіўнае становішча было выпраўлена і было зафіксаванае канчатковае — праграмнае — разыходжаньне дзьвюх палітычных плыняў. Тым ня менш нават гэтае праграмнае разыходжаньне не датычылася ідэалягічных пастулятаў, а мела дачыненьне толькі да пытаньняў тэхнічнага характару — у сэнсе сьветапогляду і бачаньня гістарычнага лёсу беларускага народу дзьве гэтыя партыі па-ранейшаму маюць шмат агульнага і па сутнасьці рэпрэзэнтуюць адну ідэалягічную плынь.

Таксама на зьезьдзе 2002 году былі ўхваленыя асноўныя рашэньні што да падрыхтоўкі партыі і ейных рэгіянальных структураў да выбараў у мясцовыя саветы дэпутатаў у 2003 годзе. Такім чынам, 2002 год стаў годам падрыхтоўкі ПБНФ да выбараў дэпутатаў мясцовых саветаў — адмова ад стратэгіі байкатаваньня выбараў сталася прынцыповай зьменай у тагачаснай партыйнай лініі. Партыя БНФ зноўку вярнулася да барацьбы за галасы выбаршчыкаў на падставе абноўленай партыйнай праграмы.

Мясцовыя выбары ў сакавіку 2003 году сталіся выпрабаваньнем для рэгіянальных структураў і лякальных лідэраў ПБНФ. Згодна зь меркаваньнем саміх партыйцаў, падчас дадзеных выбараў ПБНФ атрымала пазытыўны вынік: у адрозьненьне ад стратэгіі байкатаваньня мясцовых і парлямэнцкіх выбараў у 1999, 2000, 2001 гадах, падчас дадзенай кампаніі партыя займала актыўную пазыцыю, сябры партыі зьбіралі подпісы, кантактавалі зь людзьмі, абыходзілі кватэры, раздаючы агітацыйную прадукцыю. Упершыню за

[14] Грунтоўны аналіз праграмных дакумэнтаў БНФ розных часоў можна знайсьці ў выданьні «Беларусь: сцэнары рэформаў» (Варшава: Фонд імя Сьцяпана Батуры, 2004. — 351 с.). Побач з праграмнымі дакумэнтамі іншых беларускіх партыяў тут аналізуюцца і іншыя альтэрнатыўныя праграмы разьвіцьця беларускага грамадзтва ў параўнаньні з тым курсам, які праводзіцца дзейснай адміністрацыяй. Даецца ацэнка гэтых праектаў з пункту гледжаньня міждысцыплінарнага падыходу.

шмат гадоў выступы сяброў ПБНФ у дзяржаўных мэдыях (у тым ліку на радыё) ня мелі характару апраўданьня, а несьлі пазытыўную праграму, набліжаную да жыцьця. Нягледзячы на тое, што кандыдаты ад ПБНФ збольшага будавалі сваю праграму не на партыйнай ідэалёгіі, а на вырашэньні праблемаў лякальнай супольнасьці, яны не цураліся сваёй прыналежнасьці да апазыцыйнай палітычнай партыі. Такім чынам, падчас дадзенай кампаніі ідэалёгія ПБНФ разам з сучаснай палітычнай дактрынай партыі была данесеная да мясцовых грамадаў, але ўжо ў фармаце «апазыцыя вырашае праблемы вашай лякальнай супольнасьці», а не «апазыцыя змагаецца з антынародным рэжымам». Як адзначаў старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка, «падчас гэтай кампаніі мы ня толькі даведаліся пра праблемы мясцовых супольнасьцяў, ня толькі данесьлі да іх сваё бачаньне рашэньня гэтых праблемаў, але таксама падалі выразны сыгнал людзям — «Апазыцыя ёсьць, і яна ведае, што рабіць»[15]. Але, напэўна, непазытыўнай навіной сталася тое, што для шмат каго зь беларусаў зьяўленьне актывістаў ПБНФ было нечаканасьцю: «А мы думалі, што вас больш няма». Падчас гэтай кампаніі вялікая частка партыйных актывістаў зразумела адмоўны ўплыў старой тактыкі байкатаваньня выбараў, якой партыя прытрымлівалася ў 1999–2001 гадах: адсутнасьць працы з насельніцтвам прывяла да таго, што партыйныя актывісты адвучыліся адэкватным чынам рэагаваць на праблемы людзей. Посьпеху спрыяла і пабудова міжпартыйных рэгіянальных кааліцыяў напярэдадні выбараў: там, дзе кандыдаты ад апазыцыйных партыяў здолелі знайсьці паразуменьне з структурамі іншых партыяў і грамадзкімі арганізацыямі — там яны атрымалі посьпех. Аб’яднаная апазыцыя нарэшце адчула асалоду ад гульні ў камандзе і ад перамогі кааліцыйнай каманды.

Але галоўным і рэальным вынікам дадзенай кампаніі для партыі БНФ зьявілася тое, што шэраг партыйных вылучэнцаў атрымалі падтрымку выбаршчыкаў і былі абраныя дэпутатамі мясцовых саветаў сельскага і пасялковага, раённага і гарадзкога ўзроўню. Пры гэтым падтрымку атрымалі як тыя з кандыдатаў, хто вылучаўся ад ПБНФ як ад партыі, так і тыя, хто вылучаўся шляхам збору подпісаў — зрэшты, у афіцыйных выбарчых матэрыялах заўжды пазначалася партыйная прыналежнасьць кандыдата, таму зразумела, што насельніцтва галасавала менавіта за кандыдатаў ад ПБНФ. Упершыню з 1999 году сябры ПБНФ прыйшлі да ўлады, атрымалі дэпутацкія мандаты і адпаведны інстытуцыянальны статус як носьбіты ўлады, дэлегаванай народам. Няхай сабе роля мясцовых саветаў у беларускай палітычнай сыстэме нязначная, але гэты фактар меў вялізарнае пазытыўнае псыхалягічнае значэньне: яскравы прыклад — нацыянальная вядомасьць гораду Белаазёрску, дзе ў гарсавеце дэмакраты, пры лідэрскай ролі ПБНФ, напачатку атрымалі большасьць месцаў. Гэтыя выбары прыўзьнялі дух у партыі і падрыхтавалі яе сяброў да актыўнай працы на наступных выбарах — ужо каб здабыць мандаты дэпутатаў парлямэнту і выйсьці на нацыянальную палітычную сцэну. Пашыралася меркаваньне, што нават з гэтым выбарчым заканадаўствам, нават улічваючы адміністратыўны ўціск, нават у вельмі неспрыяльных умовах за ўладу можна змагацца электаральным чынам. Асабліва моцным гэтае адчуваньне было ў тых, хто спрычыніўся да перамогі на мясцовых выбарах.

Выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў 24 скліканьня сталіся важным выпрабаваньнем сілаў для партыі БНФ, практыкаваньнем для ўсіх этапаў выбарчай кампаніі — ад вылучэньня сваіх сяброў у склад выбарчых камісіяў, збору подпісаў на карысьць кандыдата да абскарджаньня ў судах незаконных дзеяньняў выбарчых камісіяў. З улікам папярэдняй тактыкі байкатаваньня выбараў гэта была першая спроба ПБНФ працаваць з новым выбарчым заканадаўствам, калі не лічыць прэзыдэнцкія выбары 2001 году, а для шмат каго з маладых партыйцаў — увогуле першая спроба выбарчай барацьбы, бо апошні раз партыя прымала ўдзел у выбарах у 1995 годзе. Такім чынам, ПБНФ атрымала каштоўны досьвед рэальнай працы ва ўмовах неспрыяльнага стаўленьня «гаспадароў выбарчай машыны». Падчас мясцовых выбараў у акруговыя выбарчыя каімісіі патрапіў толькі адзін вылучэнец ад ПБНФ, а яшчэ адзін сябра партыі, вылучаны ад Грамадзкага аб’яднаньня БНФ «Адраджэньне», быў уключаны ў склад тэрытарыяльнай камісіі.

Але пры гэтым нельга забывацца на тыя праблемы, якія былі выяўленыя падчас гэтай кампаніі. Так, нельга не адзначыць тую мізэрную колькасьць акругаў, на якіх выстаўляліся прэтэндэнты ад Партыі БНФ. Нават калі б усе з вылучаных Партыяй БНФ кандыдатаў атрымалі дэпутацкія мандаты, яны б не склалі і 1% ад агульнага дэпутацкага корпусу.

Было зарэгістравана 75 ініцыятыўных групаў дзеля збору подпісаў на карысьць кандыдатаў — сяброў партыі БНФ (27 — па вылучэньні ў абласныя саветы, 18 — па вылучэньні ў раённыя

---

15 Выступ старшыні Партыі БНФ Вінцука Вячоркі на сходзе сяброў партыі ў г. Бабруйску ў красавіку 2003 году.

саветы, 30 — па вылучэньні ў гарадзкія і пасялковыя саветы). Варта адзначыць, што ніводнай з заяўленых ініцыятыўных групаў не было адмоўлена ў рэгістрацыі, што вельмі адрозьніваецца ад наступных парлямэнцкіх выбараў 2004 году. 26 з 76 кандыдатаў, што вылучаліся шляхам збору подпісаў, было адмоўлена ў рэгістрацыі — у выбарчыя бюлетэні патрапілі толькі 50 кандыдатаў ад Партыі БНФ. Па выніках выбараў партыя атрымала 19 дэпутацкіх мандатаў (9 — у раённых саветах, 6 — у гарадзкіх саветах, 3 — у пасялковых саветах, 1 — у сельскім савеце), зь якіх 8 былі вылучаныя непасрэдна праз партыйнае вылучэньне ад Партыі БНФ[16]. Пазьней, у часе давыбараў, быў абраны яшчэ адзін дэпутат сельскага савету. Пры гэтым некаторыя з дэпутатаў, якія карысталіся партыйнай падтрымкай падчас перадвыбарчай кампаніі, выйшлі з партыі. Гэта сьведчыць пра тое, што некаторыя з кандыдатаў карысталіся падтрымкай з боку ПБНФ як дадатковым рэсурсам, не падзяляючы партыйнай ідэалёгіі альбо партыйнай палітычнай стратэгіі. Адзначым, што дэпутаты мясцовых саветаў ад Партыі БНФ складаюць ядро новастворанай Асамблеі дэпутатаў мясцовых саветаў, што на міжпартыйнай аснове аб'ядноўвае дэмакратычныя сілы ў лякальных прадстаўнічых органах улады.

Асобным эпізодам ва ўнутрыарганізацыйным разьвіцьці Партыі БНФ у той час стаў сыход з партыі намесьніка старшыні ПБНФ, лідэра маладзёвай арганізацыі «Малады Фронт» Паўла Севярынца — зь ім партыя страціла значную колькасьць партыйнай моладзі (тым ня менш рэальна пэўная колькасьць сябраў і нават лідэраў «Маладога Фронту» па-ранейшаму ўваходзіць у ПБНФ). Спробы партыйнай моладзі ў 2002 годзе падчас Зьезду Маладога Фронту замяніць Паўла Севярынца на іншага, больш кантраляванага чалавека, не прывялі да посьпеху — у выніку галасаваньня Вадзім Саранчукоў прайграў некалькі галасоў Паўлу Севярынцу, а пазьней адмовіўся і ад пасады намесьніка.

Яшчэ раней, да сыходу Севярынца, у лютым 2003 году, з партыі быў выключаны Вячаслаў Сіўчык. Сярод агучаных разыходжаньняў, якія сталі падставай для выхаду з партыі яе вядомых дзеячоў, называліся хаўрус з антыбеларускімі сіламі насуперак неспрыяльнаму стаўленьню да ідэалягічна блізкай КХП-БНФ, недэмакратычнае ўнутрыпартыйнае кіраўніцтва, няўвага да інтарэсаў партыйнай моладзі. Афіцыйнай фармулёўкай прычыны выключэньня В. Сіўчыка сталася ягоная самастойная палітычная дзейнасьць, што шкодзіла інтарэсам партыі. Гэтыя падзеі сталі балючым ударам для рэпутацыі партыі БНФ — за ёй замацаваўся імідж партыі з сур'ёзнымі кадравымі канфліктамі, якая ўтрымліваецца ад расколу толькі шляхам выключэньня з партыі тых асобаў, чыё імя непарыўна зьвязанае менавіта з БНФ. Тым ня менш выключэньне альбо сыход па ўласным жаданьні нязгодных з палітыкай партыйнага кіраўніцтва дазволілі прадухіліць небясьпеку расколу партыі. У пэўным сэнсе, падобныя ўнутрыпартыйныя канфлікты ёсьць парадаксальным сьведчаньнем дэмакратычнасьці альбо ўнармаванасьці ўнутрыпартыйнайга жыцьця ПБНФ — у гэтай партыі ўнутрыарганізацыйная барацьба адбываецца на падставе ўнармаваных звычаяў і правілаў працэдуры. Прынятыя ў партыі правілы паводзінаў прадугледжваюць магчымасьць жорсткай крытыкі на адрас партыйнага кіраўніцтва альбо асобаў зь іншым меркаваньнем, прадугледжваецца адкрытасьць партыйных дыскусіяў на стадыі выпрацоўкі палітычных рашэньняў. Гэта было цалкам немагчыма да 1999 году, калі любая крытычная заўвага пагражала расколам партыі альбо выключэньнем сяброў. Цяпер партыйныя канфлікты ўнутры БНФ не павінныя заганяцца ў кулюарныя інтрыгі, а павінныя вырашацца падчас адкрытага палітычнага дыялёгу на падставе прынцыпаў права і адкрытай барацьбы меркаваньняў і поглядаў.

Чарговы IX Зьезд БНФ «Адраджэньне» (VII Зьезд Партыі БНФ) сьнежня 2003 году ня стаў этапным, але і прахадным яго назваць нельга — былі падведзеныя вынікі выбараў у мясцовыя Саветы і прынятыя рашэньні што да падрыхтоўкі да наступных парлямэнцкіх выбараў — здаецца, падчас гэтага зьезду тактыка байкатаваньня выбараў ужо нікім не ўспрымалася ўсур'ёз. Былі прынятыя прынцыповыя рашэньні што да ўтварэньня перад парлямэнцкімі выбарамі шырокай кааліцыі апазыцыйных палітычных партыяў. Зноў акцэнтавалася ўвага на важнасьці павелічэньня колькасьці зарэгістраваных і пастаўленых на ўлік структураў партыі ў рэгіёнах. Таксама ў кіраўніцтве партыі адбыліся кадравыя перастаноўкі, якія адпавядалі вынікам мясцовых выбараў. Старшыня Партыі Вінцук Вячорка захаваў сваю пасаду — вылучаны альтэрнатыўны кандыдат Алесь Астроўскі з га-

[16] Дадзеныя пра партыйны ўдзел у гэтай выбарчай кампаніі і пра ягоныя вынікі можна знайсьці ў выданьнях «Выбары ў мясцовыя саветы дэпутатаў Рэспублікі Беларусь 24 скліканьня. Факты і каментары» (Мн.: ГА «Праваабарончы цэнтр «Вясна», 2003); «Выбар праз выбары. Аналіз удзелу рэгіянальных суполак партый і NGOs Рэспублікі Беларусь у выбарах у мясцовыя Саветы 2003 года» (Мн.: БАРЦ, 2003), а таксама ў згаданым вышэй выданьні Аналітычнага грудка.

радзенскай партыйнай арганізацыі ня здолеў набраць больш за 30% галасоў. Колькасьць намесьнікаў засталася ранейшай. Пасаду намесьніка захавалі Юры Хадыка і Віктар Івашкевіч, але яе страціла Галіна Сямдзянава, якая не карысталася падтрымкай у асяродзьдзі рэгіянальных лідэраў з-за свайго ўдзелу ў выключэньні з партыі Сіўчыка і Баранава, а таксама з-за свайго іміджу жорсткага і бескампраміснага кіраўніка. Былі абраныя на пасаду намесьнікаў Алесь Міхалевіч і Аляксей Янукевіч, якія прадстаўляюць новую генэрацыю партыйцаў. На гэтым зьезьдзе маладзёвая плынь у партыі здолела правесьці ў склад намесьнікаў адразу двух сваіх прадстаўнікоў, а таксама істотна павялічыла сваё прадстаўніцтва ў складзе Сойму.

Наступны, пазачарговы X Зьезд БНФ «Адраджэньне» (VIII Зьезд Партыі БНФ) адбыўся ўжо ў пэрыяд выбарчай кампаніі ў жніўні 2004 году і быў тэхнічным мерапрыемствам, скіраваным толькі на вылучэньне кандыдатаў. Ён адбываўся пад шчыльным кантролем з боку Міністэрства юстыцыі, аднак быў прызнаны легітымным і сапраўдным. Кантроль з боку Міністэрства юстыцыі і абласных Упраўленьняў юстыцыі за працэдурай вылучэньня партыйных кандыдатаў (нават з прыцягненьнем падначаленых органам юстыцыі натарыюсаў, хаця кантроль за дзейнасьцю палітычных партыяў і грамадзкіх аб’яднаньняў знаходзіцца вельмі далёка ад межаў іх кампэтэнцыі) прывёў да ліквідацыі некаторых партыйных структураў ужо пасьля гэтага зьезду. Аднак арганізацыйная пабудова партыі дазволіла правесьці паўнавартаснае партыйнае вылучэньне ў склад акруговых выбарчых камісіяў і вылучэньне кандыдатаў у дэпутаты ад Партыі БНФ. У той самы час праца па вылучэньні ў склад участковых выбарчых камісіяў была незадавальняльнай, што сьведчыць пра кепскую сувязь партыйнага цэнтру зь першаснымі арганізацыямі. Гэтыя фактары патрабуюць пільнай увагі і, магчыма, удасканаленьня партыйнай структуры.

## Структура Партыі БНФ

Напярэдадні парлямэнцкіх выбараў статутная структура Партыі БНФ засталася ранейшай. Узначальвае партыю старшыня ПБНФ, які мае на дадзены момант чатырох намесьнікаў. Вышэйшы орган ПБНФ — Зьезд, які зьбіраецца адзін раз на два гады. Дэлегаты Зьезду абіраюцца з прадстаўнікоў суполак і тэрытарыяльных арганізацыяў. У працы Зьезду могуць браць удзел прадстаўнікі грамадзкіх арганізацыяў і рухаў, якія падтрымліваюць БНФ. Такім чынам, аснову арганізацыйнай структуры партыі складаюць суполкі і мясцовыя арганізацыі. Зьезд прымае рашэньне пра стварэньне ПБНФ і яе ліквідацыю; прымае Статут ды іншыя дакумэнты ПБНФ, робіць у іх дапаўненьні і зьмены; абмяркоўвае ды прымае рашэньні па прынцыповых пытаньнях дзейнасьці Партыі БНФ, зацьвярджае асноўныя кірункі яе дзейнасьці; фармуе на два гады Сойм, зацьвярджае старшыню Партыі БНФ ды яго намесьнікаў, Рэвізійную камісію, заслухоўвае іхныя справаздачы, прымае іншыя рашэньні.

Сойм Партыі БНФ фармуецца зьездам і працуе паміж зьездамі ПБНФ у якасьці кіраўнічага органу (старшыня партыі і ягоныя намесьнікі ўваходзяць у Сойм *ex-oficio*). Колькасьць сябраў Сойму на момант парлямэнцкіх выбараў складала 47 чалавек (на VII Зьезьдзе ПБНФ былі абраныя 49 сябраў Сойму, аднак двое зь іх напярэдадні парлямэнцкіх выбараў выйшлі з партыі). Сойм Партыі склікае Зьезд Партыі і вызначае парадак прадстаўніцтва на ім; арганізуе агітацыю за выбарчую плятформу «БНФ «Адраджэньне»; зацьвярджае сьпіс кандыдатаў у дэпутаты (партыйны сьпіс) ад Партыі БНФ, калі гэта адпавядае дзейнаму заканадаўству; агітуе за гэтых кандыдатаў падчас выбараў; вылучае кандыдатаў у дэпутаты ад Партыі БНФ па акругах, вядзе за іх агітацыю; вылучае прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі; арганізуе кантроль за ходам і вынікамі выбараў; прымае рашэньні аб зваротах у дзяржаўныя органы Рэспублікі Беларусь, робіць заявы па найважнейшых пытаньнях грамадзкага жыцьця; фармуе Ўправу Сойму Партыі БНФ і вызначае рэглямэнт яе працы, зацьвярджае кіраўнікоў і склад сэкцыяў, рабочых камісіяў і групаў; уносіць зьмены і дапаўненьні ў Статут Партыі БНФ дзеля прывядзеньня яго ў адпаведнасьць заканадаўству з наступным зацьвярджэньнем на Зьезьдзе.

Управа Сойму Партыі БНФ — выканаўчы орган партыі, яна фармуецца Соймам. Структура Ўправы, пэрыядычнасьць і прынцыпы яе фармаваньня вызначаюцца Соймам (зараз яна зьбіраецца раз на тыдзень і складаецца са старшыні і намесьнікаў старшыні партыі, прадстаўнікоў камісіяў, аканома Ўправы, адказнага сакратара Ўправы і сакратара Ўправы па працы з рэгіёнамі, сакратара па юрыдычных пытаньнях). Управа Сойму Партыі забясьпечвае практычнае выкананьне рашэньняў Зьезду і Сойму ПБНФ, каардынуе дзейнасьць суполак, тэрытарыяльных арганізацыяў, Радаў, аддзелаў ды іншых мясцовых партыйных структураў, ладзіць сувязь з грамадзкімі арганізацыямі і дзяржаўнымі органамі Рэспублікі Беларусь, рэгіструе суполкі і рэгіянальныя арганізацыі, надае ім статус юрыдычнай асобы,

вырашае іншыя пытаньні дзейнасьці партыі ў прамежках паміж пасяджэньнямі Сойму; выконвае даручэньні Сойму і забясьпечвае практычную рэалізацыю функцый Сойму падчас выбарчай кампаніі. Управа Сойму Партыі БНФ знаходзіцца ў Менску па юрыдычным адрасе партыі. Рэальна менавіта Ўправа зьяўляецца стала дзейным органам апэратыўнага прыняцьця палітычных рашэньняў ад імя ПБНФ і выкананьня палітычных рашэньняў.

Таксама ў структуры партыі створаныя камісіі па накірунках дзейнасьці. Сэкцыі і камісіі Сойму Партыі БНФ абагульняюць і распрацоўваюць для пасяджэньняў Сойму і Зьезду прапановы, праекты рашэньняў. Сэкцыі і Камісіі Сойму Партыі БНФ рэгіструюцца ва Ўправе, маюць статус і правы суполкі Партыі БНФ.

***Структура партыйных камісіяў па стане на момант правядзеньня парлямэнцкіх выбараў***

| **Назва** | **Старшыня** |
|---|---|
| Палітычная | Вінцук Вячорка |
| Інфармацыйная | Віктар Івашкевіч |
| Грамадзкіх сувязяў | Вацлаў Арэшка |
| Сувязяў з грамадзянскай супольнасьцю | Алесь Бяляцкі |
| Выбарчы штаб | Галіна Сямдзянава |
| Арганізацыйна-праўная | Уладзімір Лабковіч |
| Міжнародная | Ігар Лялькоў |
| Партыйнага навучаньня | Аляксей Янукевіч |
| Камісія па культуры | Алесь Марачкін |
| Навуковых дасьледаваньняў | Не прызначаны |
| Чарнобыльская | Алесь Міхалевіч |
| Маладзёвая | Сяргей Мудрачэнка |

Сярод камісіяў асаблівую функцыю выконвае палітычная камісія, адказная за распрацоўку праектаў усіх палітычных рашэньняў і стратэгічнае плянаваньне. Менавіта гэты орган згодна з фармальнай структурай партыі выконвае функцыі мазгавога цэнтру і цэнтру распрацоўкі рашэньняў, якія выносяцца на разгляд Сойму і Ўправы. Звычайна гэтая камісія зьбіраецца за дзень да чарговага Сойму на пленарнае паседжаньне, але бягучая праца камісіі працягваецца і ў пэрыяд паміж Соймамі, існуе практыка скліканьня тэрміновых паседжаньняў палітычнай камісіі. У адрозьненьне ад іншых камісіяў, яе склад закрыты і фармуецца па пасадзе — са старшыні і намесьнікаў старшыні партыі, адказнага сакратара Ўправы, кіраўнікоў камісіяў, акрамя культурніцкай і чарнобыльскай, старшыняў абласных арганізацыяў. Менавіта на палітычнай камісіі адбываецца асноўная частка партыйных дыскусіяў і спрэчак, вынесеныя ёю рэкамэндацыі амаль ніколі не адхіляюцца Соймам.

Натуральна, Рэвізійная камісія партыі мае адмысловы статус кантрольна-рэвізійнага органу партыі.

Напярэдадні парлямэнцкіх выбараў 2004 году ў Партыі БНФ актывізавалася дзейнасьць прэсавай службы. Якасьць ейнай працы відавочна палепшылася ў параўнаньні з 2000–2002 гадамі, аднак яна яшчэ не стварае моцнай канкурэнцыі працы прэс-службаў асноўных гульцоў на апазыцыйным інфармацыйным полі — АГП і Хартыі-97. Таксама ў гэты пэрыяд відавочна палепшыўся ўзровень міжнародных сувязяў ПБНФ — быў заключаны шэраг пагадненьняў з партнэрскімі партыямі іншых краінаў, усталяваныя кантакты зь дзяржаўнымі органамі краінаў, зацікаўленых у прасоўваньні дэмакратычных зьменаў у Рэспубліцы Беларусь. За кошт пазытыўнай нацыянальнай і дэмакратычнай ідэалёгіі ПБНФ захавала вядучыя ролі ў асяродзьдзі дэмакратычнага сэгмэнту беларускай грамадзянскай супольнасьці — збольшага рэгіянальныя няўрадавыя арганізацыі дэмакратычнага кірунку больш схільныя да падтрымкі дзейнасьці БНФ, чымся іншых партыяў.

Напярэдадні выбараў Партыя БНФ валодала досыць разгалінаванай сеткай арганізацыйных структураў. Як мы ўжо адзначалі, на папярэдніх зьездах партыі менавіта гэтаму кірунку працы — рэгістрацыі і пастаноўцы на ўлік мясцовых аддзяленьняў — надавалася вялікая ўвага. Аднак варта адзначыць, што ў параўнаньні з 90-мі гадамі колькасьць партыйных структураў зьменшылася — выявіліся наступствы перарэгістрацыяў 1995 і 1999 гадоў. Да таго ж падчас разьмежаваньня з КХП-БНФ частка партыйных суполак адыйшла да новаўтворанай Кансэрватыўна-Хрысьціянскай партыі. Цяпер ужо нельга казаць, што Партыя БНФ валодае самай вялікай сеткай зарэгістраваных мясцовых філіяў.

На момант правядзеньня парлямэнцкіх выбараў 2004 году Партыя БНФ мела наступную колькасьць арганізацыйных структураў: у Менску — гарадзкая арганізацыя і 9 раённых арганізацыяў, якія аб'ядноўвалі 25 партыйных суполак; у Менскай вобласьці — абласная арганізацыя і 7 раённых, гарадзкіх гарадоў абласнога падпарадкаваньня і рэгіянальных арганізацыяў, якія аб'ядноўвалі 17 суполак; У Гомельскай вобласьці — абласная арганізацыя і 4 раённыя, гарадзкія і раённа-гарадзкія арганізацыі, якія аб'ядноўвалі 12 суполак; у Брэсцкай вобласьці — абласная арганізацыя і

6 раённых і гарадзкіх арганізацыяў, якія аб'ядноўвалі 16 суполак. У Віцебскай вобласьці не было створана абласной альбо раённай арганізацыі, дзейнічалі 5 партыйных суполак. У Гарадзенскай вобласьці абласной арганізацыі не было створана, дзейнічалі Гарадзенская гарадзкая арганізацыя і 2 суполкі. У Магілёўскай вобласьці была пастаўленая на ўлік толькі адна суполка ў Шклоўскім раёне. Такім чынам, відавочна, што магілёўскі, гарадзенскі і часткова віцебскі рэгіён не валодалі вялікім патэнцыялам у сэнсе наяўнасьці легальных партыйных структураў. Тым ня менш не заўжды колькасьць партыйных суполак, якія былі зарэгістраваныя альбо пастаўленыя на ўлік, адлюстроўвае сапраўдную колькасьць сяброў партыі ў дадзеным рэгіёне. Так, Магілёўская вобласьць, у якой дзейнічала толькі адна суполка, заяўляла пра наяўнасьць больш за 200 сяброў партыі ў Магілёве і Бабруйску, якія, аднак, не маглі стварыць арганізацыйных структураў з-за перашкодаў мясцовых уладаў (у 1999–2001 гадах у гэтым рэгіёне было ліквідавана некалькі арганізацыйных адзінак Партыі БНФ). Агулам па стане на 17 кастрычніка 2004 году афіцыйна былі зарэгістраваныя 78 партыйных пярвічных арганізацыяў ПБНФ.

На чарговым VII Зьезьдзе Партыі БНФ, які адбыўся 20 сьнежня 2003 году, згодна з паведамленьнем Сойму партыі, колькасьць сябраў партыі, якія знаходзіліся на ўліку ў партыйных структурах, складала 1389 чалавек. У той жа час, у адказе на запыт начальніка Ўпраўленьня грамадзкіх аб'яднаньняў Міністэрства юстыцыі Міхаіла Сухініна ад 1 сакавіка 2004 году адзначалася, што ў розных адміністратыўна-тэрытарыяльных адзінках Рэспублікі Беларусь і за мяжой краіны пражываюць сябры Партыі БНФ без утварэньня суполак (у колькасьці 1 альбо болей сябраў партыі ў населеным пункце). Таксама адзначалася, што некаторыя арганізацыйныя структуры партыі знаходзяцца ў працэсе рэгістрацыі. Такім чынам, па стане на сакавік 2004 году прыкладна каля тысячы прыхільнікаў партыі БНФ не былі прымацаваныя да арганізацыйных структураў партыі з-за праблемаў з рэгістрацыяй структураў. Па стане на 15 студзеня 2005 году, напярэдадні пазачарговага зьезду ПБНФ, партыйнае кіраўніцтва рапартавала пра павелічэньне колькасьці сябраў партыі ў зарэгістраваных суполках да 1435 сябраў. Для параўнаньня, напачатку 1990-х кіраўніцтва БНФ «Адраджэньне» сьцьвярджала, што ў яго шэрагах налічвалася каля 150 000 чалавек[17]. У сярэдзіне 1990-х сьцьвярджалася, што ў якасьці сябраў партыі зарэгістравана больш за 10 000 чалавек[18]. Трэба адзначыць, што цяпер улік сябраў ПБНФ не пастаўлены належным чынам — гэта зьвязана ня толькі з арганізацыйнымі хібамі, але і зь небясьпекай таго, што сьпісы сябраў апазыцыйнай партыі, патрапіўшы ў дзяржаўныя органы, могуць пашкодзіць інтарэсам партыі і выклікаць рэпрэсіі супраць шараговых партыйцаў у рэгіёнах.

Сетка зарэгістраваных партыйных структураў не заўжды перакрыжоўвалася з зарэгістраванымі структурамі Грамадзкага аб'яднаньня «БНФ «Адраджэньне». Пры гэтым па некаторых рэгіёнах шчыльнасьць зарэгістраваных структураў каляпартыйнага грамадзкага аб'яднаньня істотна перавышала колькасьць уласна партыйных пярвічак і арганізацыяў. Так, напрыклад, па Гарадзенскай вобласьці, дзе была зарэгістраваная толькі адна партыйная структура раённага ўзроўню, дзейнічала ажно 10 раённых арганізацыяў ГА «БНФ «Адраджэньне», а таксама каля 30 суполак гэтага грамадзкага аб'яднаньня. У Магілёўскай вобласьці, дзе арганізацыйных структураў раённага ўзроўню ПБНФ увогуле ня мела, ГА «БНФ «Адраджэньне» мела 3 раённыя структуры з правам юрыдычнай асобы. У сталіцы дзейнічалі 8 раённых арганізацыяў грамадзкага аб'яднаньня (у Фрунзэнскім раёне Менску была зарэгістраваная партыйная раённая арганізацыя, аднак адсутнічала структура грамадзкага аб'яднаньня). У Менскай вобласьці дзейнічалі 5 раённых і гарадзкіх структураў ГА «БНФ «Адраджэньне», у Гомельскай вобласьці — 4 структуры. Былі зарэгістраваныя Гомельская, Гарадзенская, Магілёўская, Менская абласная і Менская гарадзкая арганізацыйныя структуры ГА «БНФ «Адраджэньне» на абласным узроўні. У Берасьцейскай і Віцебскай абласьцях, дзе дзейнічалі, адпаведна, 2 і 4 раённыя арганізацыі грамадзкага аб'яднаньня, абласныя структуры не былі зарэгістраваныя. Такім чынам, сетка прыхільных да партыі грамадзкіх структураў была больш шчыльная, чым сетка ўласна партыйных арганізацыйных структураў. Амаль усе яны былі зарэгістраваныя ў 2000–2001 гадах, ужо пасьля размежаваньня з КХП-БНФ. Варта адзначыць, што колькасьць сяб-

[17] Зам А. Беларускі нацыяналізм ці нацыяналізм Беларусі? // Беларускі гістарычны агляд. 1998, № 7. С. 69–96.
[18] http://pages.prodigy.net/dr_fission/bpf/bpfintro.htm

роў ПБНФ меншая за колькасьць сяброў ГА «БНФ «Адраджэньне» — пэўная колькасьць асобаў не далучаецца да партыі, пры гэтым актыўна ўдзельнічае ў культурніцкай дзейнасьці ГА «БНФ «Адраджэньне», а некаторым зь сябраў ГА «БНФ «Адраджэньне» не дазваляе далучацца да ПБНФ іх сяброўства ў іншых партыях.

Партыя БНФ вызнае дэмакратычныя нормы ўнутрыпартыйнага жыцьця. Гэта азначае адсутнасьць культу правадыра і нясхільнасьць да пабудовы сыстэмы кліентэлы вакол лідэра партыі. Адначасова гэта дазваляе разгортваць у межах партыі партыйныя інтрыгі, фармаваць ідэалягічныя групы і блёкі, зрэшты, не перашкаджае фармаваньню асабістых кліентэл некаторых партыйных дзеячоў. Дэмакратычны лад партыйнага жыцьця прадугледжвае свабодную канкурэнцыю партыйных плыняў, іхнюю барацьбу (пра што ўжо ўзгадвалася вышэй). Няхай гэта і наносіць пэўныя страты партыйнаму іміджу, аднак рэальна ў Партыі БНФ існуе некалькі ўнутрыпартыйных груповак. Гэта выяўляецца збольшага ў шэрагах кіраўніцтва і мала закранае рэгіянальны актыў, хоць лідэры партыйных групаў і імкнуцца атрымаць прыхільнасьць рэгіянальных структураў. Можна сказаць з пэўнай доляй спрашчэньня, што ход унутрыпартыйных дыскусіяў і вынікі ва ўнутрыпартыйных спрэчках, а таксама лёс палітычных амбіцыяў лідэраў вырашаецца менавіта ў рэгіёнах. Хто з партыйных дзеячоў здолее прапанавць рэгіянальным структурам задавальняльную праграму — той і атрымае перамогу на наступным зьезьдзе.

На дадзены момант унутры ПБНФ ідэалягічна дамінуе група «старых партыйцаў», загартаваная шматгадовым сяброўствам у ПБНФ (часам — ад заснаваньня Беларускага Народнага Фронту і нават «Талакі», але ёсьць і маладзейшыя), а таксама аб’яднаная супольнай працай у часы разьмежаваньня з КХП-БНФ. Аднак гэтая дамінантная ў ідэйным пляне група не зьяўляецца адназначна кіраўнічым ядром партыі, як гэта было да 2002 году.

Кіраўнічай групай у партыі на дадзены момант зьяўляецца ўстойлівая канфэдэрацыя прыхільнікаў лідэра партыі Вінцука Вячоркі. Гэтую групу аб’ядноўвае супольнае бачаньне стратэгічных дзеяньняў партыі на бліжэйшы пэрыяд, а таксама вернасьць партыйным інтарэсам. Гэтая група ўключае ў сябе ня толькі прадстаўнікоў «старой гвардыі», але і іншых, пазьнейшых, генэрацыяў.

Ядром гэтай групы зьяўляецца «кухонны кабінэт» (5–7 чалавек) вакол старшыні партыі, у якім абмяркоўваюцца праекты партыйных дзеяньняў па стратэгічных пытаньнях з пункту гледжаньня партыйнага кіраўніцтва. З улікам таго, што старшыня партыі Вінцук Вячорка схільны да каманднай гульні і кіруе партыяй не як правадыр, а як грамадзкі лідэр — праекты рашэньняў, абмеркаваныя і зацьверджаныя ў «кухонным кабінэце», заўжды робяцца афіцыйнай пазыцыяй старшыні партыі, прапануюцца на разгляд палітычнай камісіі, Управы і Сойму. Часьцей за ўсё распрацаваныя тут праекты рашэньняў прымаюцца гэтымі органамі. Удзел у «кухонным кабінэце» не зьвязаны з атрыманьнем пэўнай афіцыйнай пасады ў партыі — у яго ўваходзяць паводле палітычнага ўплыву.

Менавіта да групоўкі «старых партыйцаў» належыць і шэраг кіраўнікоў рэгіянальных аддзяленьняў партыі. Рэгіянальныя партыйныя правадыры існуюць, але іх роля ў партыйным жыцьці не такая вялікая, яны не ствараюць пагрозы рэгіянальнага сэпаратызму, за гэтыя пасады ня б’юцца, уплыў унутры партыі можна здабываць і іншым чынам. Збольшага пасада кіраўніка рэгіянальнай партыйнай структуры дае не выгоды, а праблемы — гэтую працу звычайна выконваюць фанатычныя і самаадданыя людзі. Дынаміка зьмены партыйных кіраўнікоў рэгіянальных структураў не вызначаецца скандальнасьцю альбо канкурэнтнасьцю — звычайна ратацыя кадраў на гэтай пасадзе адбываецца са згоды прадстаўнікоў цэнтральных кіраўнічых органаў партыі альбо праз рэалізацыю мясцовых пагадненьняў.

З выключэньнем з партыі Вячаслава Сіўчыка і Паўла Севярынца ў партыі больш няма апазыцыі групе «старых партыйцаў», якая б пагражала рэалізацыі выпрацаванай гэтай групай партыйнай лініі. Адыход ад БНФ Паўла Севярынца прадухіліў насьпелы партыйны крызыс, які мог паўстаць з-за асабістых амбіцыяў Севярынца, аднак прывёў у глыбокую стагнацыю маладзёвую палітыку партыі. Амаль да 2005 году маладзёвая палітыка ў ПБНФ (якая непарыўна зьвязаная з прыцягненьнем у партыю новых прыхільнікаў) выяўлялася ў пераадоленьні наступстваў страты Маладога Фронту. Моладзь не ўтварае ў партыі самастойнай маналітнай фракцыі і разьмеркаваная паміж групоўкамі, арыентаванымі на пэрсоны двух намесьнікаў старшыні партыі — Алеся Міхалевіча і Аляксея Янукевіча. Абодва гэтыя намесьнікі разглядаюцца як асноўныя прэтэндэнты на пасаду старшыні партыі пасьля Вінцука Вячоркі, і самі яны таксама не хаваюць уласных амбіцыяў. Групоўка Алеся Міхалевіча больш моцная ў рэгіёнах, яна здолела прыцягнуць да сябе большую колькасьць прыхільнікаў з шэрагаў маладой і сярэдняй генэрацыі партыйцаў, мае

трывалыя пазыцыі ў асяродку прыхільных да партыі няўрадавых арганізацыяў. Групоўка Аляксея Янукевіча больш слабая ў колькасным пляне, але яна трымае пад кантролем шэраг стратэгічных пасадаў у партыйнай структуры і карыстаецца падтрымкай асноўнай часткі «старых партыйцаў».

Сымпатыкі былога лідэра Зянона Пазьняка (што не знайшлі моцы сыйсьці з партыі альбо не падтрымлівалі ідэю расколу) больш не ўтвараюць рэальнай палітычнай групы — ад іх зыходзіць інтэнцыя да паразуменьня з КХП, пэўны сантымэнт у дачыненьні да былога лідэра і да мінулых слаўных часоў БНФ, аднак выразнай палітычнай праграмы тут няма. Гэтая ўнутрыпартыйная дыскусія на дадзеным этапе скончана на карысьць сучаснага кіраўніцтва.

На IX Зьезьдзе БНФ «Адраджэньне» (VII Зьезд Партыі БНФ) напрыканцы 2003 году група маладых партыйцаў увайшла ў вышэйшае кіраўніцтва партыі. Скаардынаваныя дзеяньні дзьвюх груповак Янукевіча і Міхалевіча, што пазытыўна выявілі сябе падчас мясцовых выбараў і пакаштавалі смак перамогі, удзелу ў выбарчай кампаніі, дазволілі гэтым групоўкам аб’яднанымі сіламі атрымаць шэраг партыйных пасадаў. Пасады намесьнікаў у выніку ўзгодненага галасаваньня атрымалі Алесь Міхалевіч і Аляксей Янукевіч, шэраг іх прыхільнікаў увайшлі ў склад Сойму і Ўправы (заўважым, што сярод прапанаваных старшынёй партыі Вінцуком Вячоркам кандыдатураў на пасаду намесьніка не было Алеся Міхалевіча — ён быў вылучаны дэлегатамі зьезду). Іх аптымізм прыўзьняў агульнапартыйны настрой. Сфармавалася гэтая плынь ужо даўно (Севярынец называе гэтых людзей «пакаленьнем Маладога Фронту»), але ўсьвядомілі яны сваю ідэнтычнасьць у 2001–2002 гадах. Зараз, з выхадам лідэра Маладога Фронту з шэрагаў партыі (пры гэтым некаторыя зь лідэраў Маладога Фронту і шмат хто з маладафронтаўцаў не прыпынілі сяброўства ў партыі), згаданыя групоўкі вакол маладых намесьнікаў старшыні партыі зьяўляюцца цалкам канструктыўнымі — у тым сэнсе, што атаесамляюць свае ўласныя палітычныя праекты толькі ў межах партыі БНФ, то бок пытаньні вырашаюцца толькі праз здабыцьцё ўлады ў партыі, а не праз раскол. Зараз паміж гэтымі дзьвюма палітычнымі групоўкамі, якія ў межах маладзёвай плыні разам увайшлі ў вышэйшыя эшэлёны партыйнага кіраўніцтва, не назіраецца кансалідаванай працы: гэта два палітычныя праекты, скіраваныя на правядзеньне сваіх лідэраў на пасаду кіраўніка Партыі БНФ. Стратэгічнае адрозьненьне паміж гэтымі двума праектамі палягае ў пытаньні стаўленьня да дзейнага партыйнага кабінэту. Спрэчка паміж гэтымі двума праектамі будзе, напэўна, вырашаная ўжо пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2006 году, на наступным партыйным зьезьдзе, падчас выбараў старшыні партыі.

Па сацыяльным складзе Партыя БНФ традыцыйна была партыяй культурных дзеячоў і настаўнікаў (лідэры партыі), рабочай інтэлігенцыі, інжынэраў і ІТР (сярэдняе зьвяно і шараговыя партыйцы). Аднак зараз усё большую плынь ствараюць прадстаўнікі «трэцяга сэктару» — ПБНФ пераўтвараецца ў партыю «НЖО-шнікаў», менавіта яны зараз утвараюць пераважную большасьць у кіраўніцтве партыі і рэальна вызначаюць партыйную палітыку.

* * *

Такім чынам, да выбарчай кампаніі 2004 году Партыя БНФ падыйшла са спадзяваньнем разьвіць посьпех, атрыманы падчас мясцовых выбараў 2003 году. У параўнаньні з 1999–2002 гадамі партыя істотна палепшыла сваю ўнутраную зарганізаванасьць, удасканалілася структура кіраваньня партыяй, ёсьць посьпехі ў галіне інфармацыйнай працы і ў наладжваньні сувязяў з замежнымі партнэрамі. Гэта адбылося без карэннай ломкі партыйнай арганізацыі, аднак запатрабавала прыняцьця шэрагу непапулярных захадаў. Партыя захоўвае ўстойлівасьць, але пры гэтым набліжаецца па сваім стане да закрытай «сэкты» альбо няўрадавай арганізацыі з шырока разгалінаванымі рэгіянальнымі структурамі — адсутнасьць справядлівай электаральнай барацьбы і перамогаў шкодзіць ня толькі іміджу партыі, але маральнаму духу партыйных сяброў.

Палітычнае становішча ў краіне няспынна пагаршалася, распаўсюджаньне адзінай дзяржаўнай ідэалёгіі і павелічэньне ціску на іншадумцаў сьведчыла пра ажыцьцяўленьне курсу на пабудову таталітарнай мадэлі грамадзтва. У існай палітычнай мадэлі палітычныя партыі страчвалі магчымасьць выкананьня сваёй асноўнай функцыі — барацьбы за ўладу электаральным шляхам, яны засталіся толькі знакавым увасабленьнем палітычнай альтэрнатывы, якая таксама выяўляецца на ўзроўні свабодных мэдыяў і структураў грамадзянскай супольнасьці. У гэтых умовах павялічылася актуальнасьць аб’яднаўчых працэсаў у колах палітычнай апазыцыі. Партыя БНФ была адным зь ініцыятараў стварэньня напярэдадні парлямэнцкіх выбараў шырокай кааліцыі палітычных партыяў і грамадзкіх сілаў дэмакратычнай арыентацыі. «Народная кааліцыя 5+» сталася дзейсным інструмэнтам кансалідацыі ўсіх

прадэмакратычных сілаў у грамадстве. Нягледзячы на паразу на парлямэнцкіх выбарах, дадзены досьвед прадэманстраваў магчымасьць супольных дзеяньняў на карысьць дэмакратыі ў Беларусі ўсіх асноўных суб’ектаў палітычнай апазыцыі.

Але напярэдадні гэтых вырашальных падзеяў Партыя БНФ, таксама як і іншыя партыі Аб’яднаных дэмакратычных сілаў, мусіць зьвярнуць пільную ўвагу на пытаньні арганізацыйнага разьвіцьця. У дачыненьні да партыі БНФ гэта азначае ўдасканаленьне сувязяў паміж цэнтрам і рэгіянальнымі структурамі (ня толькі абласнымі, але і першаснымі), паляпшэньне інфармацыйна-аналітычнай працы і працы прэсавай службы. Неабходна правесьці пераўлік сяброў і прыхільнікаў партыі для вызначэньня чалавечага рэсурсу Партыі БНФ — звычайнага анкетаваньня ўдзельнікаў Зьезду і кіраўнікоў першасных аддзяленьняў для гэтай працы, відавочна, ужо недастаткова. ПБНФ мусіць разьвіваць і пашыраць сувязі з грамадзкімі аб’яднаньнямі дэмакратычнай скіраванасьці — інакш гэты рэсурс партыі можа быць страчаны. Прыкладам гэткай працы можа быць актывізацыя маладзёвага накірунку ў дзейнасьці партыі, які быў зьвязаны з выкарыстаньнем нефармальных маладзёвых ініцыятываў, у тым ліку і зьвязаных з зачыненым Нацыянальным гуманітарным ліцэем імя Я. Коласа. Ва ўмовах зачысткі грамадзянскага сэктару, гэта значыць ліквідацыі вялікай колькасьці незалежных грамадзкіх аб’яднаньняў, павялічылася ўвага да юрыдычных аспэктаў дзейнасьці партыі. І, самае галоўнае, шматгадовы досьвед паразаў у партыйнай дзейнасьці прывёў да таго, што за партыяй трывала замацаваўся імідж няўдачнікаў, якія ня здольныя дамагчыся рэалізацыі ўласных плянаў. З-за гэтага партыя губляе ня толькі імідж у вачах насельніцтва, але таксама і ўласных сяброў — з партыі сыходзяць, зь ёй страчваюць сувязь, да яе не далучаюцца новыя сябры. Жыцьцёва неабходна павысіць матывацыю партыйнай дзейнасьці, заахвоціць актыўных і прыцягнуць новых сяброў партыі. Неабходныя новыя формы ўнутрыпартыйнай камунікацыі паміж сябрамі партыі, паміж кіраўніцтвам і шарагоўцамі, паміж рэгіянальнымі структурамі, а таксама новыя шляхі матываваньня партыйцаў. Перад партыяй стаіць задача стварэньня пазытыўнага вобразу перад сваімі сябрамі, што зьяўляецца неабходным папярэднім крокам перад стварэньнем пазытыўнага вобразу ў вачах насельніцтва.

Толькі навуковы і сур’ёзны падыход да партыйнага жыцьця зь непрадузятым разуменьнем хібаў і пралікаў кіраўніцтва дазволіць пераўтварыць беларускія палітычныя партыі ў рэальнага актора палітычнай сыстэмы. Партыі БНФ вельмі бракуе прафэсійнага аналітычнага цэнтру. Дастаткова часта партыйнае кіраўніцтва вымушанае рэфлексаваць над чужымі прапановамі і кіравацца ў сваёй дзейнасьці чужымі напрацоўкамі. Адсутнічае цэнтар аналізу бягучай палітычнай сытуацыі з партыйнага пункту гледжаньня, які мог бы ня толькі пастаўляць партыйнаму кіраўніцтву абгрунтаваныя высновы і прапановы для прыняцьця палітычных рашэньняў, але і ствараў бы якасныя пляны дзеяньняў партыі на кароткатэрміновую пэрспэктыву.

Дадзены нарыс павінны служыць актывізацыі дасьледніцкай працы ў накірунку вывучэньня сапраўднага стану і разьвіцьця беларускіх палітычных партыяў. Вызначэньне моцных і слабых бакоў кожнай з партыйных арганізацыяў дэмакратычнай кааліцыі, разуменьне пагрозаў і магчымасьцяў партыяў уяўляе як практычны, так і навуковы інтарэс. Здабыцьцё ведаў пра рэальныя праблемы партыйнай сыстэмы прыносіць карысьць навуцы і можа служыць інтарэсам дэмакратычных пераўтварэньняў у Беларусі.

*Літаратура*


1. *Антысавецкія рухі ў Беларусі: 1944–1956. — Мн.: Архіў Найноўшае Гісторыі, 1999.*
2. *Беларусістыка: Палітычныя партыі Беларусі: Тэматычны зборнік. — Мн.: НАН Беларусі, Аддз. навук. інфарм. па гуманітар. навуках, 1996. — 414 с.*
3. *Беларуская палітычная сыстэма і прэзыдэнцкія выбары. — Мн.: Аналітычны грудок; Варшава, IDEE, 2001. — 480 с.*
4. *Беларусь: сцэнары рэформаў. — Варшава: Фонд імя Сьцяпана Батуры, 2004. — 351 с.*
5. *Буховец О., Фурман Д. Электоральное поведение белорусских регионов // Белоруссия и Россия: общества и государства. — М.: Права человека, 1997. С. 184–225.*
6. *Бюлетэнь беларускай незалежніцкай партыі. Орган вызвольнага Сялянска-Работніцкага Руху. № 1. Перадрук // Беларускі Рэзыстанс. 2005, № 1(2). С. 63–84.*
7. *Бяляцкі А. Дваццаць год таму… // Бюлетэнь Асамблеі НДА. 2002, № 2–4.*
8. *Бяляцкі А. Канспірацыя // Асамблея. 2004, № 6–7.*
9. *Володин В. В., Огурцов Е. Е. Гражданская партия, хроника, факты, люди, события. Мн., 2000.*
10. *Выбар праз выбары. Аналіз удзелу рэгіянальных суполак партый і NGOs Рэспублікі Беларусь у*

выбарах у мясцовыя Саветы 2003 года. — Мн.: БАРЦ, 2003. — 36 с.

11. Выбары ў мясцовыя саветы дэпутатаў Рэспублікі Беларусь 24 склікання. Факты і каментары. — Мн.: ГА «Праваабарончы цэнтр «Вясна», 2003. — 144 с.

12. Выборы Президента Республики Беларусь — 2001: Факты и комментарии. — Мн.: Тесей, 2002. — 248 с.

13. Дэмакратычная апазыцыя Беларусі: 1956–1991. Пэрсанажы і кантэкст. — Мн.: Архіў Найноўшае Гісторыі, 1999.

14. Зам А. Беларускі нацыяналізм ці нацыяналізм Беларусі? // Беларускі гістарычны агляд. 1998, № 7. С. 69–96.

15. Информационный бюллетень Объединенных демократических сил. 2005, № 1.

16. Кузнецов Н. В. Политические партии Беларуси: от истории к современности. — Мн.: НКФ «Экоперспектива», 1996. — 31 с.

17. Маніторынг парламенцкіх выбараў і рэспубліканскага рэферэндума ў Рэспубліцы Беларусь. 2004 год. — Мн.: Праваабарончы цэнтр «Вясна», 2005. — 152 с.

18. Медыя-маніторынг у Беларусі: «Парламенцкія выбары 2004 года ў сродках масавай інфармацыі Беларусі». — СПб.: Невский простор, Беларуская асацыяцыя журналістаў, 2005. — 96 с.

19. Мясцовыя выбары ў найноўшай палітычнай гісторыі Беларусі. — Мн.: Аналітычны грудок, 2003. — 296 с.

20. Навіны БНФ. 2005, № 1 (79)–5 (83).

21. Найноўшая гісторыя беларускага парлямэнтарызму. — Мн.: Аналітычны грудок, 2005. — 320 с.

22. Наумова С. Политические партии в Республике Беларусь: динамика развития // Адкрытае грамадства. 2000, № 2 (8). С. 8–12.

23. Национальная безопасность Республики Беларусь. Современное состояние и перспективы / Мясникович М. В., Никитенко П. Г., Пузиков В. В. и др. — Мн.: ИООО «Право и экономика», 2003. — 562 с.

24. Неформальные объединения в политической жизни республики. — Мн., 1990.

25. Носаў С. Ты памятаеш, як усё пачыналася… // ARCHE. 2004, № 5.

26. Падзелу БНФ на партыю і рух не адбылося // Свабода. № 24. 16.06.1995. С. 4.

27. Палітычныя партыі Беларусі. — Мн.: «Згода», 1994. — 264 с.

28. Парадак правядзення грамадскай кампаніі па вылучэнні адзінага кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. — Мн.: Планава-аналітычная група Аб'яднаных дэмакратычных сілаў, 2005. — 34 с.

29. Парламентские выборы в Беларуси, январь 1996 года. — Мн.: НИСЭПИ, 1996. — 352 с.

30. Плиско М. Партогенез в современной Беларуси // Адкрытае грамадства. 2000, № 2 (8). С. 13–23.

31. Побудова ефективноï политичноï партiï. — Киев: Фонд «Європа-XXI», 2003. — 288 с.

32. Политические партии Беларуси. — Мн.: БГЭУ, 1997. — 136 с.

33. Политические партии Беларуси — необходимая часть гражданского общества: материалы семинара / Авт.-сост. Александр Федута, Олег Богуцкий, Виктор Мартинович. — Мн.: Фонд им. Ф. Эберта, 2003. — 113 с.

34. Политические партии Беларуси перед вызовом парламентских выборов: аналитический доклад. — Мн.: НИСЭПИ, 1995. — 34 с.

35. Политические партии: Беларусь и современный мир. — Мн.: Тесей, ОО «Белорусский центр конституционализма и сравнительно-правовых исследований», 2002. — 368 с.

36. Правовой статус политических партий в европейских странах. — Мн.: Тесей, ОО «Белорусский центр конституционализма и сравнительно-правовых исследований», 2003. — 232 с.

37. Праграма Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне». Менск, 30 траўня 1993 г.

38. Праграма Беларускай Незалежніцкай Партыі // Za Volu. — Мн., 1995. — № 2.

39. Праграма БНФ «Адраджэньне». Менск, 1сьнежня 2002 г. — 16 с.

40. Праграмныя дакумэнты БНФ «Адраджэньне». Мн.: Рэдакцыя друкаваных органаў БНФ «Адраджэньне», 1989. — 38 с.

41. Референдум и выборы в Палату представителей 2004 года. Факты и комментарии. — М.: Можайск-Терра, 2004. — 124 с.

42. Сборник альтернативных программ развития Беларуси. — Мн.: Бестпроинт, 2001. — 432 с.

43. СМИ и выборы: гид для белорусского журналиста. — Спб.: Невский простор, 2004. — 104 с.

44. Федута А. О роли парламентских партийных фракций в политическом развитии Беларуси // Аналитический бюллетень белорусских фабрик мысли. 2001, № 1. С. 24–26.

45. Чавусаў Ю. Цэнтры цяжару ідэалягічнай працы // ARCHE. 2004, № 2.

46. Silitski V. Belarus // Nations in Transit. 2004. Democratization in East Central Europe and Eurasia. — N. Y., Freedom House Survey Team, Rowman & Littlefield Publishers, 2004. S. 96–122.